PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok/
niva_bielastok@poczta.onet.pl

№ 4 (2437) Год XLVIII Беласток, 26 студзеня 2003 г. Цана 2,00 зл.

Можам гаварыць толькі пра палагоджанне праблемы. Без грошай яе не вырашым, — сказаў падляшскі віцэ-маршалак Ян Камінскі.

Пуці ў Еўропу

Пару дзён да перамоў з ПКП падляшская маршалкоўская ўстанова паведаміла грамадству пра свае намеры і планы ў справах, якія ёй падлягаюць. Новыя ўлады рашылі пастаянна арганізаваць тэматычныя прэс-канферэнцыі. У гэты раз датычыла яна якраз пасажырскіх рэгіянальных перавозаў. Мясцовыя ўлады атрымліваюць з цэнтра субвенцыю на дафінансаванне ліній, якія можа ўспамагчы ваяводская ўстанова, паколькі дзейнічае яна для жыхароў на сваёй тэрыторыі (як зазначыў маршалак Януш Кшыжэўскі), а манапалістычная дзяржаўная чыгунка, з прычыны сваіх фінансавых праблем, ліквідуе нявыгадныя ёй лініі.

Пакуль няма шанцаў вырашыць праблему мясцовых камунікацый на Падляшшы. Урадавая субвенцыя будзе такая, як леташняя — 9,5 млн. злотых. Гэта на 16 мільёнаў менш, чым мелі атрымаць згодна з законам аб рэструктурызацыі чыгункі. Гэтага хопіць, каб дафінансаваць 30% цягнікоў. Трэба шукаць альтэрнатыўных спосабаў транспарту. Улады гарантуюць, што не хочуць зачыняць чарговых ліній. Але гэта пагражае ўсім спалучэнням, побач якіх на раскладах бачым літарку *„G" — kursuje do odwołania*. Гаворыцца перш за ўсё пра лінію Семяноўка — Цісоўка, па якой ездзіць няшмат пасажыраў (найбольш ва ўікэнды), з чаго 80% гэта самі працаўнікі ПКП (яны не плацяць за праезд). Калі б лінію ліквідавалі, трэба было б пастарацца забяспечыць пасажырам аўтобус. Закрыццё лініі пагражае таксама шляху Беласток — Чаромха. Тут справа таксама і ў „хуткасці" цягнікоў, якія курсіруюць на гэтых лініях.

Маршалкоўская ўправа абмяркоўвае таксама магчымасць купіць „аўтобус", які называюць таксама „трамваем" — вагон, які едзе па пуцях. Такі аўтобус каштуе каля 5 мільёнаў злотых. Калі ўдасца яго купіць за паўцаны (а ёсць, кажуць, такая магчымасць — набылі такі танны ў Любліне), Падляшша яго прыдбае. Паніжае ён радыкальна кошт перавозаў.

Пра гэту праблему думаюць таксама мясцовыя гмінныя і павятовыя самаўрады. „Не хочам быць белай плямай на карце ваяводства", — заўважыў Мікола Павільч, войт Нараўчанскай гміны. Гміны, напрыклад, не бяруць падатку ад прыпынкаў. Якраз там на месцы гэта праблема найбольш баліць, і то не найбольш чыноўнікаў, а ўсіх жыхароў, якія яшчэ засталіся проста жыць, а не хочуць быць у тупіку „на канцы свету".

Міра Лукша

Пра планы ПКП чытайце на 3 стар.

Фота: http://www.posg.pl

Пагранзастава ў Дубічах-Царкоўных

Новыя гранічныя інвестыцыі

Адкрыццё на польска-беларускай мяжы новага пагранперахода ў Хварасцянах, турыстычнага перахода ў Белавежы і магчымасць перасякання мяжы аўтамабілямі грузаёмістасцю да 7,5 тоны на пагранпераходзе ў Полаўцах заявіў міністр унутраных спраў і адміністрацыі Кшыштаф Янік.

Гэтая заява прагучала 11 студзеня г.г. у ходзе візіту паслоў дзяржаў-членаў Еўрапейскага Саюза на Падляшша. Дыпламаты ў суправаджэнні міністраў унутраных і замежных спраў, галоўнага каменданта Гранічнай стражы і шэфа Галоўнай мытнай установы знаёміліся з аховай усходняй мяжы Польшчы, якая неўзабаве мае стаць ўсходняй мяжой Еўрасаюза. Госці наведалі пагранзаставу ў Дубічах-Царкоўных, паглядзелі дэманстрацыю магчымасцей спецыяльнага ўзвода пагранічнікаў і пабывалі непасрэдна на польска-беларускай мяжы ў Белавежскай пушчы.

Гранічныя інвестыцыі на Падляшшы каштаваць будуць 280 млн. еўра, якія Польшча атрымае на паляпшэнне памежнай інфраструктуры. Міністр Янік нагадаў, што ў даны момант рашэнне наконт новых пагранпераходаў застаецца за беларускім бокам, які аб гэтым быў праінфармаваны адпаведнымі дыпламатычнымі нотамі. Цяпер Польшча чакае адказу.

— Хочам, каб вонкавыя еўрасаюзныя пагранпераходы былі на адпаведным еўрапейскім узроўні. Думаю, што ў студзені 2005 года завершыцца разбудова граніцы на Падляшшы, — дадаў міністр унутраных спраў і адміністрацыі. — На тэхніку і абсталяванне спатрэбяцца грошы ЕС, а будаўнічыя працы прафінансуе Польшча.

Граніца ў Белавежскай пушчы будзе ахоўвацца з дапамогай электронных перыметрычных прыстасаванняў. На граніцы, у зямлі, будуць пастаўлены рознага тыпу дэтэктары, напрыклад, руху, якія цераз сістэму індыкатараў і тэлекамер будуць паведамляць найбліжэйшую пагранзаставу аб перасячэннях мяжы. Электронная сістэма, дзякуючы адпаведным камп'ютэрным праграмам, дазволіць вызначыць, ці парадак на граніцы парушыла жывёла, а калі так, то якая.

У сувязі з г.зв. ушчыльненнем усходняй мяжы сёлета Гранічная страж прыме на службу 1 300 чалавек, у тым ліку 250 пагранічнікаў да Падляшскага аддзялення ў Беластоку. Агулам да 2005 г. будзе прынята на працу ў Гранічнай стражы 5 300 чалавек.

Вонкавая граніца Еўрапейскага Саюза пасля далучэння Польшчы складзе 1 583 кіламетры. Пагранічнікі ацэньваюць, што ў апошніх гадах сістэматычна падае лік асоб перасякаючых граніцы Польшчы. У рэкордным 2000 г. мяжу перасякло 278 млн. чалавек, а ў 2002 г. — 189 млн. (на 16% менш, чым у 2001 г.). На 15,5% знізіўся лік пераязджаючых граніцу аўтамабіляў у 2002 г. — да 52 млн. машын.

У 2002 г. у Польшчы за незаконнае перасячэнне мяжы пагранічнікі затрымалі 5 тысяч асоб. Найбольш нелегалаў намагаецца пранікнуць у Польшчу, і далей у Нямеччыну, цераз Славакію. З граніцы былі вернуты назад 52 тысячы чужаземцаў па прычыне адсутнасці віз або фальшывых дакументаў.

Найбольш праблемаў на ўсходняй граніцы ўзнікае на мяжы з Украінай, якая не прымае назад нелегальных эмігрантаў. Затое беларускі бок узмацняе ахову мяжы, а не дапамагае нелегалам, аб чым непраўдзіва і ў сенсацыйным тоне пісаў нядаўна штотыднёвік „Wprost".

Паводле Onet.pl Wiadomości і Onet.pl Biznes

У Збучы яшчэ ёсць маладыя

☞ 3

Як толькі даведалася я, што хлопец са Збуча, не змагла ўстрымацца. О, кажу, дык у вас яшчэ не перавяліся маладыя! А мне ж калісь здалося, што ў Збучы засталіся адно пенсіянеры. „Не, ёсць і моладзь, — запярэчыў мне Анатоль Сапяжынскі. — Яшчэ ў нас дзейнічае больш дваццаці гаспадарак".

Праваслаўныя палякі і татары

☞ 4

На вынікі перапісу вялікі ўплыў мелі анкецёры, якія хадзілі па хатах з анкетамі. У большасці былі гэта людзі з пачуццём патрыятычнай місіі, менталітэтам абаронцаў польскасці „крэсаў". Нацыянальнасць часам упісвалі самі, не пытаючы рэспандэнтаў, а калі нехта пратэставаў, што не з'яўляецца палякам, тады пераконвалі старым аргументам: „W Polsce pan mieszka, więc jest pan Polakiem".

Манюшка, якога не ведаем

☞ 5

Манюшка дакладна вывучыў фальклор, не толькі польскі. Вучань кампазітара А. Іванскі ўспамінаў, што ў Смаргоні маэстра паклікаў яго ў карчму паглядзець беларускі танец. Такім вось чынам Манюшка знаёміўся з народнымі легендамі, песнямі і танцамі.

Аб Святой Зямлі

☞ 9

Вернікі з Гайнаўкі былі прысутны ў Базіліцы Магілы Гасподняй у час сашэсця Святога Агню, якое адбываецца толькі перад святкаваннем праваслаўнымі Уваскрэсення Гасподняга. Айцец Васілій чакаў гэтага здарэння амаль цэлыя суткі. Толькі некалькі гадзін адпачываў седзячы і мусіў адступіць з блізкага ад магілы месца, калі займалі яго грэчаскія паломнікі.

Тры гады прымусовай працы

☞ 10

Выгружаліся ў Вормдыт. Затым пераехалі ў Гайльсберг. Завялі ў вялікую залу, дзе нямецкія гаспадары чакалі нас. Зала была перагароджана шкляной сцяною і змяшчалася там сцэна. Паставілі ў шарэнгу. Баўэры аглядалі нас і выбіралі.

Сродак інфармацыі

☞ 11

Перад вайною толькі некалькі чалавек мелі свае радыёпрыёмнікі, і то з навушнікамі. Арцём Чыквін першы раздабыў такое радыё — сам слухаў і іншым даваў паслухаць і гэта было як свята. А дзядзька Яшка сам сканструяваў такое радыё і ўначы мог нават слухаць Маскву...

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Інфармацыйныя змены

У радыё- і телеэфіры Беларусі апошнім часам адбываюцца змены, якія інакш як суверэнізацыяй інфармацыйнай прасторы назваць нельга. У той жа час праяўляецца і асноўная прычына такіх дзеянняў — спроба абмежавання для беларускіх грамадзян доступу да іншага пункту погляду на тыя ці іншыя падзеі.

З распадам Савецкага Саюза ўзніклыя новыя незалежныя дзяржавы пачалі дбаць аб як мага большым інфармацыйным уплыве на сваіх грамадзян. На іх тэрыторыі як грыбы пасля дажджу з'яўляліся новыя радыёстанцыі і тэлеканалы. Часцяком такая з'ява адбывалася за кошт расійскіх тэлестанцый, якія літаральна некалькі гадоў таму былі ўсесаюзнымі і з-за таго іх трансляцыя была абавязковая на ўсім абшары СССР.

Нейкім не зусім зразумелым выключэннем з агульнага постсавецкага інфармацыйнага працэсу была Беларусь. На працягу ўсіх 90-х гадоў мінулага стагоддзя беларуская ўлада нібыта не заўважала, што ў яе суверэннай краіне існуе толькі адзін нацыянальны тэлеканал — Беларускае тэлебачанне. У той жа час прысутнасць расійскіх, якія па сутнасці з'яўляюцца замежнымі, тэлепраграм у некалькі разоў пераўзыходзіла мясцовыя. Калі зважаць на такія прапорцыі, то старонняму назіральніку магло б здацца, што ён знаходзіцца ў якімсьці аўтаномным нацыянальным утварэнні Расіі, а не ў незалежнай беларускай дзяржаве.

Уплыў расійскага тэле- і радыёэфіру на рускамоўную Беларусь даваў адэкватны вынік. Мясцовыя грамадзяне ў сваёй пераважнай большасці папросту не глядзелі нацыянальнае тэлебачанне і не слухалі нацыянальных радыёстанцый. Таму і пра жыццё суседняй Расіі, маецца на ўвазе грамадскае, палітычнае і эканамічнае, ведалі нашмат больш чым пра жыццё сваёй Радзімы. У другой палове папярэдняга дзесяцігоддзя такі стан рэчаў цалкам задавальняў беларускую ўладу, кіраўнік якой надта імкнуўся ў Крэмль.

Аднак мінулы год надзвычай яскрава праявіў нядобрую для цяперашняга кіраўніцтва тэндэнцыю, якой садзейнічалі непаразуменні і канфлікты ў беларуска-расійскіх дачыненнях. Грамадзянам Беларусі, якія працягвалі жыць у расійскай інфармацыйнай прасторы, усё больш даспадобы станавіліся тыя парадкі і тыя погляды на рэчаіснасць, якія прапагандавалі „саюзніцкія" радыёстанцыі і тэлеканалы. Адпаведна і аўтарытэт беларускага эфіру заставаўся не толькі нізкім, але і ўжо выклікаючым кпіны. Сапраўды, назіраць за шматгадзіннымі селектарнымі нарадамі прэзідэнта можна было толькі па службовых абавязках альбо маючы нейкія нездаровыя схільнасці.

У такіх варунках сённяшняе беларускае кіраўніцтва зразумела магчымасць усё большага адчужэння ад уласнага грамадства ў інфармацыйным плане. З-за гэтага некалькі месяцаў таму беларускі бок значна скараціў вяшчанне ўсіх прысутных у Беларусі чатырох расійскіх тэлеканалаў, а з новага году спыніў рэтрансляцыю на тэрыторыю краіны праграмы буйных расійскіх радыёстанцый „Маяк",„Голос России" і „Юность". Тлумачэнне такім дзеянням даецца звычайнае і зразумелае — трансляцыя гэтых праграм ажыццяўлялася за кошт беларускага бюджэту, а зараз не хапае сродкаў. Таму на ультракароткіх хвалях, дзе раней можна было пачуць не толькі расійскую папсу, але і адрозны ад афіцыйнага беларускага пункт погляду на тыя ці іншыя падзеі, цяпер будуць гучаць толькі перадачы мінскага радыё і праграмы абласных радыёстанцый.

Калі разглядаць такое дзеянне ў рэчышчы палітычнай барацьбы і адпаведна палітычнага ўплыву напярэдадні мясцовых выбараў і магчымага рэферэндуму, які можа дазволіць А. Лукашэнку кіраваць больш за дзве кадэнцыі, то становіцца сумна за грамадзян Беларусі. Бо цяпер яны здолеюць глядзець і слухаць толькі тое, што ім пакажуць ці распавядуць праўрадавыя электоронныя СМІ, а не тое, што хочуць пабачыць ці пачуць самі.

У той жа час не бывае ліха без дабра. Нягледзячы на значны якасны пройгрыш беларускага эфіру перад маскоўскім, у першага ўзнікаюць надзвычайныя магчымасці росту. І падаецца вельмі верагодным, што праз некалькі гадоў ці дзесяцігоддзяў, калі ў Беларусі запануе свабода слова і журналісты не будуць баяцца карыстацца ёй, беларуская радыё- і тэлетэхнічная база ўжо будзе цалкам адпавядаць сапраўдным нацыянальным патрабаванням.

Уладзімір Лапцэвіч

Беларускамоўных выданняў — 119

Па стане на 1 студзеня сёлетняга года ў нашай краіне было зарэгістравана 1355 перыядычных выданняў. Аб гэтым карэспандэнту „Звязды" паведамілі ў Міністэрстве інфармацыі Беларусі.

Сярод зарэгістраваных выданняў налічвалася 851 газета і 435 часопісаў, 56 бюлетэняў, 3 каталогі і 2 альманахі. Таксама ў Беларусі зарэгістравана 8 інфармацыйных агенцтваў. Большасць зарэгістраваных выданняў рускамоўныя. Іх налічваецца 481. Выключна беларускамоўных выданняў зарэгістравана 119. Таксама вялікая колькасць выданняў выходзіць на абедзвюх мовах адначасова.

Часцей за ўсё заснавальнікамі друкаваных выданняў з'яўляюцца прадпрыемствы і арганізацыі з недзяржаўнай і змешанай формамі ўласнасці. Такіх выданняў па стане на 1 студзеня было 578.

Сяргей Кузняцоў
„Звязда", 10.01.2003 г.

Літаратурны інтарэс

9 студзеня Аляксандр Лукашэнка прыняў старшыню Беларускага літаратурнага фонду Мікалая Чаргінца, які быў абраны на гэтую пасаду на сходзе гэтага грамадскага аб'яднання 19 снежня 2002 года. Добра, што прэзідэнт краіны цікавіцца пісьменніцкім жыццём-быццём, але пры гэтым ён чамусьці ігнаруе новага старшыню Саюза пісьменнікаў Алеся Пашкевіча, які ачоліў гэтую арганізацыю яшчэ ў леташнім верасні.

Чаму такая няроўная ўвага? А рэч у тым, што Мікалай Чаргінец не проста пісьменнік, не проста старшыня Беларускага літаратурнага фонду, але яшчэ і член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі. То-бок, чалавек ад улады, чаго не скажаш пра Алеся Пашкевіча, самага маладога старшыню Саюза пісьменнікаў за ўсю ягоную гісторыю. Алесь Пашкевіч і ягоныя намеснікі прадстаўляюць у Саюзе пісьменнікаў так званых пісьменнікаў-дэмакратаў, Мікалай Чаргінец — праўладную групоўку пісьменнікаў-кансерватараў, якія на з'ездзе Саюза пісьменнікаў з трэскам прайгралі, але затое адыграліся на сходзе Літфонду.

Прыняўшы Чаргінца праз паўмесяца пасля ягонага абрання старшынёю Літфонду і пры гэтым ігнаруючы вось ужо некалькі месяцаў старшыню Саюза пісьменнікаў, прэзідэнт тым самым яшчэ раз пацвердзіў той факт, што нашы пісьменнікі, на жаль, падзелены палітыкай. Прэс-служба кіраўніка дзяржавы паведамляе, што на сустрэчы з Чаргінцом прэзідэнт сказаў, што „краіна і народ чакаюць новых цікавых твораў, якімі можна было б ганарыцца. І многае тут залежыць ад саміх пісьменнікаў — іх адносінаў да народа і дзяржавы". Тэзіс з намёкам, але не ў гэтым рэч. Было б куды больш дарэчы, каб пра творчасць прэзідэнт гаварыў усё ж з Алесем Пашкевічам, а вось пра матэрыяльна-тэхнічную базу якраз з Мікалаем Чаргінцом.

Многія пісьменнікі паўжартам параўноўваюць гэтую сітуацыю з тым, калі б, прыкладам, прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін афіцыйна прыняў не прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку, а кіраўніка спраў прэзідэнта.

Цяпер у пісьменніцкіх колах чакаюць два варыянты развіцця падзей. Першы: улады паспрабуюць ператварыць Літфонд у альтэрнатыўную Саюзу пісьменнікаў літаратарскую суполку. Другі, больш верагодны, варыянт такі: усяляк падтрымліваць, у першую чаргу фінансава, Беллітфонд і ігнараваць Саюз пісьменнікаў. Калі ён апынецца ў заняпадзе, а ягонае кіраўніцтва будзе такім чынам дыскрэдытаванае, можа быць праведзены пазачарговы з'езд арганізацыі з мэтай змены старшыні.

Захады могуць быць тут такія.

На сустрэчы з Чаргінцом прэзідэнт, паводле ягонай прэс-службы, быў праінфармаваны аб дзейнасці Беларускага літаратурнага фонду і з разуменнем паставіўся да праблемаў гэтага грамадскага аб'яднання. А праблемаў хапае. Дзяржава можа дапамагчы разлічыцца з даўгамі, адрамантаваць Дом адпачынку „Іслач", не выключана, што аддасць нават Дом літаратара, паспрыяе багатаму выданню кніг. Гэта можа пашырыць шэрагі праўладнай пісьменніцкай групоўкі. Выдаць тую ж кніжку беларускім літаратарам сёння надзвычай цяжка. На думку Аляксандра Лукашэнкі, падтрымку Літфонду павінны атрымаць і ветэраны, і маладыя пісьменнікі.

Акрамя таго, ходзяць чуткі, што дырэктар холдынга „ЛіМ" Таіса Бондар збіраецца звярнуцца з просьбай да Саюза пісьменнікаў дапамагчы фінансава літаратурна-мастацкім выданням, заснавальнікам якіх ён з'яўляецца. Калі ў Саюзе грошай не будзе, яны знойдуцца ў Літфондзе, якому перададуць статус заснавальніка шэрагу літвыданняў.

Такі вось літаратурны інтарэс.

Кірыла Пазняк
„Белорусские новости", 12.01.2003 г.

Заява Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь

МЗС Беларусі ўважліва сочыць за развіццём сітуацыі, звязанай з затрыманнем у аэрапорце горада Бейрут групы, якія па сцвярджэнні шэрагу інфармацыйных агенцтваў быццам бы быў прызначаны для прамой пастаўкі ў Ірак з Рэспублікі Беларусь.

Беларускі бок не выключае, што вышэйзгаданыя публікацыі праследуюць мэту стварыць негатыўны фон напярэдадні плануючагася візіту ў Рэспубліку Беларусь Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна і прынізіць значнасць пытанняў, якія належаць абмеркаванню на Вышэйшым Дзяржаўным Савеце.

У гэтай сувязі МЗС афіцыйна заяўляе, што Рэспубліка Беларусь строга кіруецца ўсімі міжнароднымі абавязацельствамі і агульнапрынятай практыкай гандлю маёмасці спецыяльнага прызначэння.

Супрацоўніцтва з Іракам ажыццяўляецца ў строгай адпаведнасці з санкцыямі Савета Бяспекі ААН, што катэгарычна выключае любыя пастаўкі тавараў двайнога прымянення ў гэту краіну.

У Рэспубліцы Беларусь дзейнічае строгая сістэма экспартнага кантролю, якая дазваляе эфектыўна вырашаць пытанні прадухілення несанкцыянаваных паставак спецыяльнай маёмасці за мяжу ў абыход усталяванага парадку.

Упаўнаважаныя органы Рэспублікі Беларусь могуць у любы момант даць неабходныя тлумачэнні па згаданых відах дзейнасці пры паступленні адпаведных афіцыйных запытаў.

Мінск, 15 студзеня 2003 года

Аб правядзенні беларускага балю ў Варшаве

11 і 12 студзеня г.г. у Варшаве прайшоў Беларускі Навагодні баль, у якім прыняло ўдзел больш 300 прадстаўнікоў беларускага асяроддзя сталіцы Польшчы. Беларускі баль быў арганізаваны Варшаўскім аддзелам Беларускага грамадска-культурнага таварыства пры падтрымцы Пасольства Беларусі ў Польшчы. У гэтым годзе пасля двухгадовага перапынку адбылося аднаўленне традыцый супольнай сустрэчы Новага года па старым стылі беларусамі Варшавы.

У святкаванні прынялі ўдзел мазавецкі ваявода, намеснік міністра дзяржаўнай уласнасці, іншыя прадстаўнікі дзяржаўных устаноў Польшчы і супрацоўнікі дыпламатычнай місіі Беларусі ў Варшаве.

www.mfa.gov.by

Ад 1 лютага зменшыцца колькасць мясцовых чыгуначных спалучэнняў у Падляшскім ваяводстве

Каму пуці, каму?..

Дзяржаўная чыгунка гатова аддаць свае шляхі ў распараджэнне мясцовых самаўрадаў. А тыя ўзялі б усе, калі б мелі грошы. Зменіцца, вядома толькі адно: расклад. Ваяводскі самаўрад вядзе перамовы з дзяржаўнай чыгункай. Галіна Кужына, дырэктар Падляшскага прадпрыемства рэгіянальных перавозаў ПКП упэўнена:

— Вядома адно: напэўна будзе зменшана колькасць цягнікоў. Ранішнія цягнікі, начныя...

Тут справа не толькі ў паяздах, якія возяць людзей на працу і прывозяць на начлег. Моцна ўдарыць гэта таксама па сувязі з усёй краінай — абмяркоўваецца, напрыклад, пытанне закрыцця лініі Сувалкі — Лодзь, вельмі выгаднай для пасажыраў, а нявыгаднай манапалістычнай польскай чыгунцы, суполцы *PKP Polskie Linie Kolejowe*. Літарка *G* паяўляецца не толькі пры лакальных назвах тыпу Цісоўка, але і Элк, Сувалкі. Мабыць, і пры лініях у Кузніцу, а нават і ў Варшаву. Сёлета ледзь не палова (!) цягнікоў мае статус „kursuje do odwołania". Адно нараканне — няма грошай і ў іх. Транспарт маюць арганізаваць самаўрады на сваёй тэрыторыі. Грошы дае ім урад (субвенцыя) — перадаючы не канкрэтна маршалкоўскай установе, а ваяводу, а той — ёй. Чыгунка разлічвала, што сёлета атрымае ад урада (праз самаўрады) 800 тысяч зл. А будзе мець толькі 300 тысяч.

— Падляшша атрымае, замест чаканых 20, крышку больш за 9 мільёнаў, — сказаў маршалак Януш Кшыжэўскі.

— Паводле нашых вылікаў, дэфіцыт Прадпрыемства пасажырскіх перавозаў у 2003 годзе будзе большы за 20 мільёнаў, — сказала Галіна Кужына. — Застаўся і леташні доўг. Адзіны выхад для нас — „завешваць" мясцовыя лініі Гайнаўка — Цісоўка, Беласток — Чаромха, Чаромха — Седльцы.

Ваяводству прапануецца 11 такіх ліній, якія, як заўважаецца ў прадстаўленым уладам рапарце, *z przyczyn ekonomicznych nie stanowią przedmiotu zainteresowania spółki PKP SA*. Управа ПКП Польскіх чыгуначных ліній у Варшаве прапанавала маршалкоўскай установе гэтыя нявыгадныя сабе лініі. Апошняя пакуль адмовілася. А адзіны прыбытак ПКП дае толькі лінія Беласток — Варшава.

Павятовае староства ў Гайнаўцы выказала зацікаўленне пераняць лінію Леўкі — Белавежа і Белавежа — Белавежа-Палац (каля 2 кіламетраў). Уладзімір Пятрочук, гайнаўскі стараста, бачыць нейкую ў гэтым надзею: калі б удалося пераняць лінію з Гайнаўкі ў Белавежу, пашукалі б прыватнага інвестара, можна было б рушыць не толькі пасажырскі транспарт, але і турызм. Дало б надзею на нейкі зрух і адкрыццё пагранперахода ў Белавежы. Грошай таксама можна было б пастарацца ў еўрапейскіх фондах...

Так што надзею трэба мець. Хоць пуці зарастаюць травой і самасейкамі. У Еўропу.

Міра Лукша

Другі раз вазьму парашут...

У Збучы яшчэ ёсць маладыя

Сустрэліся мы ў бальніцы. Малады чалавек ездзіў на калясцы або зрэдку хадзіў на кастылях. Казалі: ён з аўтамабільнай катастрофы.

Як толькі даведалася я, што хлопец са Збуча, не змагла стрымацца. О, кажу, дык у вас яшчэ не перавяліся маладыя! А мне ж калісь здалося, што ў Збучы засталіся адно пенсіянеры. І адразу захацелася даведацца, што чуваць у вёсцы.

Не, ёсць і моладзь, запярэчыў мне Анатоль Сапяжынскі, трыццаць два гады ад роду. Яшчэ ў нас дзейнічае больш дваццаці гаспадарак. Так, палічыў Анатоль, з аднаго боку — адзінаццаць гаспадарак, і з другога — чатырнаццаць. Разам — дваццаць пяць, а ў Збучы восемдзесят сем нумароў. Ёсць у нас нават маладыя гаспадары.

Як на сённяшні час, дык гэта і так някепска. Вёска Збуч знаходзіцца ў Чыжоўскай гміне, ад Чыжоў — тры кіламетры, а ад Мора — усяго два.

Бацькі Анатоля цяпер на пенсіі. Гаспадарку ў 1995 годзе па палавіне перапісалі на яго і брата Віктара. Анатоль аж да часу нешчаслівага выпадку апрацоўваў гаспадарку з сям'ёю. Там жа, гаворыць Анатоль, робім усе разам: бацькі, я і брат з жонкай.

Што прадукуюць збучане? Займаюцца ўсім патроху. Толькі адзін малады чалавек сее адно збожжа, кукурузу і вырошчвае цукровыя буракі, а пасля прадае гэта. Ён не трымае ні кароў, ні свіней. Але ўсе (больш пенсіянеры) дык то кароўку, то парсючка трымаюць, то курку, то гуску, а часам і індыка. Гаспадары сеюць збожжа, цукровыя буракі, кукурузу, ну, і гадуюць жывёлу ў асноўным сабе.

Моладзь у святліцы іграе ў пінг-понг або ў карты, а таксама глядзіць тэлевізар. Некаторыя прыязджаюць толькі на лета, калі маюць летнія канікулы. Многія сталі настаўнікамі, афіцэрамі, дактарамі, медсёстрамі.

Фота Ады Чачугі

Ёсць у Збучы аўтазапраўка „Пронару" з бензінам і саляркай, ёсць крама. „Ніву" чытаюць, „Збучанкі" спяваюць.

Пра ўсё гэта расказвае мне Анатоль Сапяжынскі, а пра свае здзяйсненні замнога не гаворыць. Ведаю аднак, што было б пра што расказаць. Але можа пагаворым пра гэта пры іншай нагодзе.

1 сакавіка Анатоль у аўтамабільнай катастрофе паламаў ногі. Гэта ўжо другі яго нешчаслівы выпадак, але Анатоль не здаецца. Я буду хадзіць! — гаворыць ён і сварыцца з жанчынамі, якія з недаверам качаюць галовамі. Другі раз вазьму парашут, абяцае ім ён, і ўсміхаецца.

Ада Чачуга

ПСС „Сполэм" у Гайнаўцы

Юбіляр у добрай форме

Сёлета Усеагульны кааператыў спажыўцоў „Сполэм" у Гайнаўцы будзе святкаваць 80-годдзе свайго існавання. Гэта адзін з найбольш заслужаных кааператываў пушчанскага горада.

Кааператыў „Сполэм" у Гайнаўцы дзейнічае ад 1923 г. У міжваенны перыяд меў шэсць крамаў ды ад прыватных асоб арандаваў каўбасную і пякарню. Вёў прадуктовую краму ў пушчанскім пасёлку лясных работнікаў у Тапіле. Пасля вайны найперш пусцілі ў ход пякарню, а пасля тры крамы і сталовую. У 1948 годзе прынялі новую назву — Кааператыў спажыўцоў у Гайнаўцы. Ужо ў наступным годзе меў ён шаснаццаць крамаў, пякарню і каўбасную. У 1950 годзе пачала вытворчасць фабрыка газіраваных ахаладжальных напояў ды разлівачная піва. У 1952 годзе фірма прыняла назву Усеагульнага кааператыва спажыўцоў у Гайнаўцы.

У 1959 годзе кааператыў меў таксама тры крамы ды рэстаран „Турыстычны" ў Белавежы. У тым жа годзе пабудавалі ўласны шматпавярховы аб'ект у цэнтры горада. На першым паверсе гэтага будынка шмат гадоў знаходзіўся рэстаран „Гайнавянка". У 1962 годзе адкрылі асяродак „Практычная пані", у якім праводзіліся курсы крою і шыцця ды рацыянальнага харчавання, а таксама цырульніцкія паслугі. У 1967 годзе ў кааператыве былі 43 крамы і чатыры сталовыя, працавала 300 чалавек. На працягу 25 гадоў старшынёю кааператыва быў Вацлаў Бэльтэр. У 1978 годзе працавала тут 445 асоб. Пяць гадоў пазней кааператыў назвалі „Сполэм" ПСС.

Зараз у „Сполэм" працуе 170 асоб. Мае ён 18 крамаў, пякарню. Яго візітнай картачкай з'яўляецца гандлёвы дом „Люкс" па вуліцы 3 Мая. Кааператыў дапамагае ў арганізацыі і правядзенні культурных, спартыўных, а таксама дабрачынных мерапрыемстваў.

Янка Целушэцкі

Новы бюджэт

У час апошняй у 2002 годзе сесіі Рады горада Гайнаўка, якая адбылася 30 снежня, радныя разглядалі гарадскі бюджэт. Гарачую дыскусію выклікала прапанова дафінансавання на мінулагоднім узроўні гарадскога кіно, якое дзейнічае ў Беларускім музеі ў Гайнаўцы. Бурмістр Анатоль Ахрыцюк прапанаваў выдзеліць на кіно 60 тысяч злотых. Некаторыя радныя ад СЛД-УП і правых груповак прапанавалі прыглянуцца рэнтабельнасці кіно і ў першай чвэрці года вырашыць яго будучыню. Паводле іх, замала людзей прыходзіць у кіно, каб даплачваць да яго. Камісія асветы запрапанавала выдаткаваць на дзейнасць кіно ў першай чвэрці года 15 тысяч злотых, 45 тысяч злотых з прапановы бурмістра перанесці ў рэзерв, правесці грунтоўны аналіз дзейнасці кіно і вырашыць ці патрэбнае яно гайнавянам. З гэтай ідэяй не згадзіліся радныя Беларуска-народнага выбарчага камітэта. Яўген Янчук адзначыў, што зараз кіно ў Польшчы развіваецца і прапанаваў шукаць дадатковыя сродкі на яго развіццё ў горадзе. Купля новай апаратуры і выдаткаванне большых сродкаў на новыя фільмы маглі б прыцягнуць большую колькасць гайнавян і паправіць рэнтабельнасць. Перад галасаваннем папраўкі ў справе кіно радныя СЛД-УП папрасілі перарваць працу Рады і пайшлі на кансультацыі. Пасля перапынку галасамі большасці радных СЛД-УП і ўсіх радных БНВК прапанова абмежавання сродкаў на дзейнасць кіно была адкінута.

Прапанову адной з камісій наконт выдзялення з рэзерву 40 тысяч злотых на актуалізацыю дакументацыі будовы крытага басейна бурмістр Анатоль Ахрыцюк прадставіў як сваю папраўку і не трэба было галасаваць за ёй. Іншыя прапановы радных былі адкінуты і галасамі радных СЛД-УП і БНВК бюджэт горада на 2003 год быў прыняты. Найбольш грошай выдзелена ў бюджэце на асвету і выхаванне (7 828 тыс. зл.), сацыяльную апеку (5 425 тыс. зл.), адукацыйную і выхаваўчую апеку ў дзіцячых садках (2 976 тыс. зл.) і публічную адміністрацыю (2 694 тыс. зл.). На інвестыцыі запланавана толькі 696 тыс. зл. Гарадскія ўлады спадзяюцца атрымаць дадатковыя сродкі на інвестыцыі з еўрапейскіх фондаў. Сярод бюджэтных сродкаў для арганізацый непадпарадкаваных уладам горада 30 тыс. зл. атрымае Саюз „Любіцелі царкоўнай музыкі" з Гайнаўкі на арганізацыю Гайнаўскіх дзён царкоўнай музыкі, 8 тыс. зл. Гайнаўскі фонд камернай і арганнай музыкі і 10 тысяч злотых Дом міласэрнасці „Самаранін" на дабрачынную дзейнасць.

Дыскусію выклікала прапанова абмежавання спецыяльнага дадатку да зарплаты бурмістра горада Анатоля Ахрыцюка з 2 390 зл. на 1 195 зл. Прапанова выйшла ад радных клуба СЛД-УП і іх галасамі была прынята. Іншыя радныя ў выдатнай большасці стрымаліся ў час галасавання. Зарплата гайнаўскага бурмістра была большай, чым у суседніх гарадах падобнай велічыні.

Аляксей Мароз

Бліжэй пацыента

У Гмінным асяродку здароўя ў Нараўцы пасля некалькігадовага перапынку аднавілі прыём пацыентаў у кабінеце рэабілітацыі. Цяпер наведваюць яго перш-наперш пажылыя жыхары Нараўчанскай гміны (у сярэднім 10-12 асоб кожны дзень) з рэўматычнымі захворваннямі ды з выраджэннямі. Лечаць іх ультрагукамі, радыётэрапіяй і гарачым парафінам.

Да нядаўна пацыенты былі вымушаны ездзіць у Гайнаўку, а там чэргі па месяцы-паўтары. Вядома, за праезд таксама трэба плаціць. Цяпер куды лепш, выгадней, а да таго і без чэргаў.

У кабінеце рэабілітацыі прымае медсястра Альжбета Внук. Неабходна мець толькі накіраванне з амбулаторый рэабілітацыі ды артапедычнай або ад неўролага.

(яц)

Вачыма паляка

Візы і вясковы сырок

Не ўцячэш ад дум, якія кранаюць уваход Польшчы ў Еўрасаюз. І думаю так сабе, што больш пытанняў у гэтай тэме могуць мець беларусы, украінцы ці расіяне, чым самі палякі. Ну бо як жа ад гэтага лета кантактавацца з блізкімі, сябрамі, якія не за справай сённяшняга пакалення засталіся з таго боку мяжы (або з гэтага, калі глядзець з іхнага). Быццам міністр замежных спраў Владзімеж Цімашэвіч прадказвае, што візы, асабліва для ўсходніх нашых суседзяў, будуць лёгкадаступныя, шматразовыя і танныя, а часам, як для студэнтаў — нават і бясплатныя. Але гэта толькі абяцанні, абумоўленыя перш за ўсё тым, які будзе крок беларускага, украінскага ці расійскага бакоў. Па прынцыпе заложніка: калі прадстаўнікі ўраду Беларусі ўвядуць палякам візы за — для прыкладу — не тры, а дваццаць долараў, то Польшча будзе мусіла зрабіць падобнае ў адносінах да грамадзян Беларусі, для якіх гэта аграмадныя грошы. І нават той, хто прыедзе ў Польшчу, бо з гэтага жыве, будзе вымушаны „падбіць" цэны, от, хоць бы на „Норд-Стары" ці „LM".

Тым часам Цімашэвіч, былы прэм'ер, гаворыць пра неабходнасць увядзення віз (вынік трактата з Шэнген):

— Справа ў паспяховасці ў змаганні з памежнай паталогіяй, між іншым, кантрабандай. Але Усходняя сцяна выразна адчуе вынік еўрасаюзнай рэгіянальнай палітыкі.

Пры нагодзе іншы прэм'ер, сёння еўрапейскі банкір Кшыштаф Бялецкі дадае:

— Малыя мястэчкі на Усходняй сцяне гэта лакальная і найлепшая дарога для сыскання інфраструктурных фондаў з Еўрасаюза.

Яшчэ адзін былы прэм'ер Тадэуш Мазавецкі, аднак, асцерагае:

— У ніякім выпадку не можа быць ніякай жалезнай заслоны!

А іншы былы старшыня Рады Міністраў Юзаф Алексы рашуча сцвярджае:

— У Польшчы трэба апрацаваць канцэпцыю рэгіянальнага развіцця, дзякуючы якой зможам загаспадарыць еўрасаюзныя сродкі.

І так працягваецца дыскусія, не толькі паміж прэм'ерамі. Ды сапраўды не бачу што з гэтага вынікае наканец для нашага рэгіёна, для нас, палякаў і беларусаў, для нашых прыватных і службовых сувязей з палякамі і беларусамі з таго боку.

Былы маршалак Сената Анджэй Стэльмахоўскі тым часам дамагаецца карты паляка, якая гарантавала б лёгкі кантакт палякам ва ўсходняй а(й/б)чызне з радзінным краем (пэўна, справа ў абмежаванні ў нейкай форме візавага закону). А я, паляк, пытаюся: чаму не ўвесці чагосьці такога, на ўзор гэтай карты, для беларусаў (і не толькі) сямейна павязаных з нашымі польскімі беларусамі. Ну, калі ўжо мае дзейнічаць той прынцып узаемнасці, хай спрацуе і тут. Пэўна, адрасат тае ідэі — у Мінску, не ў Варшаве. Каб мне не мяшацца ў справы чужое краіны, толькі пра яе намякну...

Вяртаемся да справы Еўрасаюза. Абяззбройвае мяне свайго роду лёгкасць з захаплення Еўрасаюзам у некаторых публічных асоб, якія прапагандуюць тую лёгкасць хоць бы ў тэлебачанні. Вось вельмі аўтарытэтная радыёжурналістка і грамадскі дзеяч Галіна Мірашова сцвярджае:

— Урэшце не будзем мусіць думаць, ці Міцкевіч гэта паляк ці літовец. Ён будзе проста наш!

Незалежна ад вялікае павагі да сумленнай пані Мірашовай, — што ж можа быць дурнейшага? Багаццем Еўрасаюза мае быць урэшце ж спадчына культур паасобных народаў, якія ўваходзяць у яго склад. Значыць, спадчына і Міцкевіч, якога адны хочуць бачыць палякам, а іншыя — літоўцам, не ўспамінаючы аб іншых, нееўрасаюзных народах, якія ідэнтыфікуюцца з песняром. Ну, але я магу зразумець паню Мірашову, для якой радасць ад уступлення Польшчы (і, між іншым, прыбалтыйскіх краін) засланяе ўсе межы, нават у абсягу аднаго толькі польскага рэгіёна — мазавецкага. У тым жа выказванні ў тэлебачанні, у якім Міцкевіч меў страціць свае карані, горад Пёнтніца (вядомы таксама па-за межамі з вырабу вясковых сыркоў) апынуўся на поўначы Мазовіі. Мне, аднак, здаецца, што ён ляжыць на паўночным захадзе Падляшша. Аднак, можа і я, і пані Мірашова кіруемся менш ці больш свядома пачуццём лакальнага патрыятызму, якое прынамсі мне падказвае неабходнасць фармавання нацыянальнай рэгіянальнай самасвядомасці (адкінуўшы розныя формы малазразумелага нацыяналізму). Так, вось, пані Галіна: гэта **ТУТ**, а не там робяць знакамітыя вясковыя сыркі!

Мацей Халадоўскі

Фота НАТАЛЛІ ГЕРАСІМЮК

Гайнаўскія вучні з апякункай Людмілай Грыгарук

Праваслаўныя палякі і татары

Хаця няма яшчэ вынікаў мінулагодняга перапісу насельніцтва, аднак можна спадзявацца, што колькасць беларусаў у Польшчы будзе невялікая. Аптымістычны вынік не павінен перасягаць лічбы 30 тысяч. Зразумела, афіцыйна пададзеная колькасць не будзе мець нічога супольнага з рэальным станам, таксама як не маюць нічога супольнага з рэальнасцю лічбы, якімі акрэсліваюць беларускае грамадства ў Польшчы нашы дзеячы. Асіміляцыя сталася фактам і пераважная большасць праваслаўных сёння лічыць сябе палякамі. Дзяржаўны апарат працаваў над такім ходам спраў дзесяткі гадоў.

На вынікі перапісу вялікі ўплыў мелі анкецёры, якія хадзілі па хатах з анкетамі. У большасці былі гэта людзі з пачуццём патрыятычнай місіі, менталітэтам абаронцаў польскасці „крэсаў". Нацыянальнасць часам упісвалі самі, не пытаючы рэспандэнтаў, а калі нехта пратэставаў, што не з'яўляецца палякам, тады пераконвалі старым аргументам: „W Polsce pan mieszka więc jest pan Polakiem". У асноўным аднак тыя, якіх да гэтага часу вонкавы свет бачыў як беларусаў, самі заяўлялі пра сваю польскасць. Нават мужыкі, якія самі пра сябе думалі яшчэ нядаўна ў катэгорыях тутэйшасці ці рускасці, цяпер пад уплывам спаланізаваных дзяцей і ўнукаў сталі таксама палякамі.

Вынікі мінулагодняга перапісу стануць гістарычным фактам і праз дзесяць гадоў ніхто не будзе задумоўвацца над тым, якія фактары паўплывалі на такі стан. Прадметам аналізу будуць толькі вынікі. Вучоныя стануць разважаць колькі сярод беларусаў было сялян, лекараў, беспрацоўных, настаўнікаў, студэнтаў, якая ў нас структура ўзросту, якія сацыяльныя ўмовы нашага жыцця. Тыя, якія запісаліся палякамі, стануць часткай саракамільённай масы і ніхто не будзе звяртаць увагу на іх сапраўдную свядомасць, хаця праваслаўныя палякі ў нічым па менталітэце непадобныя на палякаў-каталікоў. Каталікам лозунгі „Ян Павел II", „Юзэф Пілсудскі", „Раман Дмоўскі", „Стэфан Вышынскі", „цуд над Віслай", „студзеньскае паўстанне", „Крэсы ўсходнє" „Чанстахова", „Салідарнасць" гэта фундаменты нацыянальнай свядомасці, апоры гістарычнай памяці. Сярод праваслаўных палякаў гэтыя ж лозунгі выклікаюць раздражненасць.

У 1921 г. быў праведзены першы перапіс насельніцтва ў незалежнай Польшчы. Паказаў ён, што на тэрыторыі паўночна-ўсходніх ваяводстваў пражывала трохі больш за мільён беларусаў, 550 тысяч праваслаўных палякаў і пару соцень тысяч тутэйшых. Ніхто асабліва не задумоўваўся над тым, адкуль, напрыклад, у Кобрынскім павеце ўзялося амаль 62 працэнты палякаў. Аказваецца, што палову праваслаўных чыноўнікі запісалі да гэтай нацыянальнасці, аб чым яны магчыма самі не ведалі. Пару гадоў пазней варшаўскія, віленскія, львоўскія, кракаўскія ці познаньскія вучоныя праводзілі вельмі цікавыя разважанні вакол гэтай статыстыкі. Захапляліся тым як „крэсовы люд" не падпарадкаваўся русіфікацыі і ў вырашальны момант гісторыі аб'явіў сваю тоеснасць. Бедныя, непісьменныя палескія сяляне нават не ведалі якімі вялікімі патрыётамі сталі ў навуковай і публіцыстычнай літаратуры. Хаця ў сакрэтных дакументах пісалася „granica prawosławia jest dla polskości nieprzekraczalną", аднак на ўжытак палітыкі прапагандаваліся інфармацыі пра сотні тысяч крэсавых палякаў праваслаўнага веравызнання.

Сёння ў школьных падручніках змяшчаюцца вынікі перапісу 1921 і 1931 гадоў і ніхто нават не прабуе тлумачыць, што не мелі яны нічога супольнага з рэальным станам. Аўтарам гэтых падручнікаў праўдападобна вядомыя аналізы даваенных даследчыкаў Лявона Васілеўскага, Канстанціна Срокаўскага, пасляваенных гісторыкаў Ежы Тамашэўскага ці Януша Жарноўскага, у якіх даказана, што, напрыклад, колькасць беларусаў была ўдвая вышэйшая за вынікі перапісу. Гістарычная свядомасць грамадзян фарміруецца на падставе школьных падручнікаў, а літаратура, якая паказвае праўдзівы стан рэчаў, даступная толькі нешматлікім спецыялістам. Самыя навейшыя падручнікі па гісторыі, якія будуць друкавацца праз некалькі гадоў, паінфармуюць маладых грамадзян Польшчы, што на тэрыторыі краіны пражывае некалькі тысяч беларусаў. Далей можна будзе разважаць пра традыцыйную талерантнасць і пра тое, як мірна побач сябе жывуць палякі, яўрэі, татары, армяне, беларусы, украінцы, немцы, літоўцы, чэхі і славакі. Сёння, напрыклад, хаця на Беласточчыне татараў амаль зусім няма, у Кракаве ці Познані можна пачуць: „U was na Białostocczyźnie to pełno i Tatarów, i Białorusinów, i Litwinów". „Tak, — адказваю тады, — szczególnie w Białymstoku często słyszy się tatarską gwarę".

Яўген Мірановіч

Наведалі Беларусь

Наталля Герасімюк, бібліятэкар Беларускага музея ў Гайнаўцы, арганізавала вучням гайнаўскіх падставовых школ, якія вучацца беларускай мове, экскурсію ў Беларусь. Вучні, якімі апекаваліся Наталля Герасімюк, Людміла Грыгарук, настаўніца беларускай мовы у Падставовай школе н-р 6 у Гайнаўцы і гайнаўскі фатограф Уладзіслаў Завадскі, затрымаліся на начлег у Санаторнай школе „Інтэрнат" у Высокім. У школе гэтай вучацца і адпачываюць дзеці з забруджанай Чарнобыльскай зоны. Спачатку вучні наведалі старадаўні парк, царкву, касцёл і маёнтак Патоцкіх у Высокім. На другі дзень дзеці паехалі ў Брэсцкую крэпасць, дзе зайшлі ў царкву. Вучням спадабаўся шкляны саркафаг Археалагічнага музея ў Брэсце, які знаходзіцца пад адкрытым небам. Дзеці былі ў Камянецкай вежы, Музеі прыроды і Запаведніку са звярынай, які знаходзяцца ў Камянюках. Мелі нагоду пабываць у беларускай частцы Белавежскай пушчы.

(ам-з)

Блакітныя вокны — гэта ўжо Беларусь

Калі мая мама згадзілася, каб я паехала з маім сябрам Тамашом і яго сястрой Касяй у Мінск, падумалася мне, што гэта толькі жарт. Аднак... 25 верасня 2002 г. мы выехалі з беластоцкага вакзала.

Нашто ж трое маладых людзей едзе за мяжу ў пачатку навучальнага года?! А менавіта таму, што ў сталічным Парк-Клубе „Мінск" адбываўся рок-канцэрт у рамках „Восені польскай культуры". Ігралі тады польскія гурты „Оркестра на Здрове", познаньская „Піджама Порно" ды „T. Love". У дадатак выступіла легенда беларускай рок-сцэны „Н.Р.М." Такой непаўторнай нагоды нельга было прапусціць.

Падарожжа пачалося зусім нетыпова... У Баброўніках у аўтобус увайшло двух памежнікаў. У аднаго я доўга заглядзелася — ён нагадваў мне кагосьці... Адвярнулася я ўправа, а там Кася таксама глядзіць на памежніка. Хто гэта такі? Амаль у той жа момант абедзве мы сказалі, што памежнік выглядае як Лявон Вольскі! Тамаш згадзіўся з намі. Ці гэта магчыма, што ў Вольскага брат-блізнюк? Гэтага мы ўжо не даведаліся, хаця мелі вялікую ахвоту зрабіць „Лявону" здымак (але мы пабаяліся канфліктаў з уладай...). З мяжы шчасліва паехалі мы праз Ваўкавыск ды Слонім у сталіцу. Апрача „знаёмага" памежніка ў Беларусі прывітаў нас інтэнсіўны пах ваўкавыскай птушкафермы.

Зараз за мяжою нашу ўвагу прыцягнулі блакітныя вокны, дзверы, платы ў вёсках. „Блакітныя вокны — гэта ўжо Беларусь", — сказаў Тамаш. Праўда, гэты колер вылучаўся вельмі моцна позняй парой. Дайшлі мы да вываду, што пэўна там блакітная фарба самая танная, і таму яна такая паўсюдная.

У сталіцы заўважылі мы шыльду грыль-бара „Печкі-Лавачкі", дзе можна паспрабаваць таямнічага напою „Крамбамбуля", вядомага (прынамсі з назвы) фанатам апошняга музычнага праекта Лявона Вольскага пад аднайменным загалоўкам. Дарэчы, пакарысталіся мы гэтай магчымасцю... „Печкі-Лавачкі", што ў цэнтры Мінска, аказаліся вельмі ўтульным барам з цікавым меню (апрача самой „Крамбамбулі" рэкамендую вінегрэт „Акунья Матата").

26 верасня, чацвер. Мінская публіка добра прыняла замежных гасцей. Найбольш ёй спадабалася „Піджама Порно", хаця і „T. Love" атрымаў шумнае адабрэнне, калі яго вакаліст праспяваў другую версію песні на англійскай мове (думаў, што больш людзей яе зразумее, чым па-польску?): „I don't care of president..." „T. Love" таксама выступіў паспяхова. Паміж песнямі публіка крычала „Жыве Беларусь!", а польскія гурты згодна ім уторылі. Па-над нашымі галовамі лунаў бел-чырвона-белы сцяг. Палякі і беларусы ўмелі знайсці агульную мову.

Сам Н.Р.М. даў незвычайны канцэрт — іншы ад усіх, якія бачыла я ў Польшчы. Ведаю, што нямнога людзей „адсюль" магло такое пачуць. Шмат энергіі, супрацоўніцтва; вакаліст Лявон Вольскі перакідваўся жартамі з гітарыстам Пітам Паўлавым, а нават (!) — саскочыў са сцэны ў публіку (шчасліва). Артысты зрабілі амаль жа міні-спектакль.

Зусім новую афарбоўку набылі для мяне некаторыя песні. Асабліва, калі Лявон спяваў, што яму „цяжэй і цяжэй знайсці сваю вуліцу і пазнаць", што „будуюць новыя гмахі" (хопіць пабачыць мінскія вуліцы...). Беларускую сучаснасць апісаў ён наступным чынам: „купіць бы даляры, прадаць бы рублі" — словамі песні з іх новага альбома „Дом культуры".

Няцяжка было прыкмеціць знаёмства членаў „Піджамы Порно" і „Н.Р.М." Польскія музыкі запрашаюць беларусаў у Познань на „Мінскую вясну", а мінскія мастакі робяць такую ж імпрэзу ў сябе.

Не абышлося таксама без знаёмства з мінскім гарадскім транспартам. Пазналі мы тралейбусы, цягнікі (яны даражэйшыя чым аўтобусы), метро. Апошні від транспарту найбольш характэрны Мінску. Знаёмства пачалі мы са станцыі Леніна — адзінага месца, дзе можна паглядзець мульцікі (вучні і студэнты спецыяльна прапускаюць заняткі, каб паглядзець, напр. Scooby Doo), праз вагоны метрапалітэна, абклееныя налепкамі Радыё Свабода, а скончылі на трагічнай Нямізе. Ужо пасля першага падарожжа на метро асталася з намі мантра: „Асцярожна. Дзверы зачыняюцца. Наступная станцыя..." Я магла б гэта паўтарыць нават прачнуўшыся пасярэдзіне ночы!

У самім Мінску былі мы 25, 26, 27 верасня („25, 26, 27" — гэта загаловак песні Н.Р.М., як заўважыў Тамаш). Вярталіся мы праз сонную і прыгожую Гародню. Не трэба нам было прыпамінаць дваццацігадовай даўнасці скетчы Зянона Лясковіка, каб заглыбіцца ў атмасферу мінулага часу. На гродзенскім вакзале побач кожнай касы чытаем: „Кніга скаргаў і прапановаў знаходзіцца ў дзяжурнага па вакзале".

Прызнаюся, што гурты Н.Р.М. ці „Уліс" ведаю дзякуючы Радыё „Рацыя". Шкада, што ўжо нічога новага не даведаюся з рацыйнага эфіру, з перадачаў РокГітПарад ці РокФерма, якія вёў Стэп. Астаюся з маімі стужкамі і добрымі словамі маіх сяброў. Што рабіць далей? Марыць? Цешыцца мінулым? Думаю, што ў пэўным сэнсе так.

Кажуць, што шалёныя людзі шчаслівыя. Рацыя (105,5)! „Мы проста дзеці — блукаем па свеце".

Анна Лушынская (Лімонка)

Вучацца беларускай мове

Сярод вучняў падставовых школ найбольш асоб вучыцца беларускай мове ў Падставовай школе н-р 3 у Бельску-Падляшскім (582 асобы). У Бельскім павеце навучанне беларускай мовы вядзецца яшчэ ў падставовых школах у Орлі (93), Ягуштове (76) і Храбалах (33). У Гайнаўскім павеце найбольш вучняў вучыцца беларускай мове ў падставовых школах Гайнаўкі (294), Гайнаўскай (143), Чыжоўскай (119) і Нарваўскай гмін (107). У Беластоцкім павеце і горадзе Беластоку беларускай мове вучацца дзеці ў Падставовай школе ў Гарадку (77), Падставовай школе н-р 4 у Беластоку (46) і Падставовай школе ў Рыбалах (38).

Не ўсе вучні, якія вучыліся беларускай мове ў падставовых школах, рашаюцца вучыцца гэтай мове ў трохгадовых гімназіях. Сярод гімназістаў найбольш вучняў вучыцца беларускай мове ў Гімназіі н-р 3 у Бельску-Падляшскім (345), Гімназіі з дадатковай вучобай беларускай мовы ў Гайнаўцы (179), іншых гайнаўскіх гімназіях (129), гімназіях у Нараўцы (74), Чыжах (65) і ў Дубінах (63). З ліку сярэдніх школ навучанне беларускай мове вядзецца толькі ў Бельскім (465) і Гайнаўскім (389) белліцэях. Іншыя вучні адукацыю на роднай мове канчаюць у гімназіях. (ам-з)



Двор ва Убелі, дзе нарадзіўся Станіслаў Манюшка

Манюшка, якога не ведаем

Гаворачы аб укладзе Станіслава Манюшкі ў польскую музычную культуру, найчасцей называюцца некалькі опер („Галька", „Страшны двор", „Графіня") і песень з „Хатніх спеўнікаў". Музычная спадчына Манюшкі малавядомая ў Польшчы і амаль зусім невядомая за мяжою. Толькі дзякуючы настойлівасці спявачкі Марыі Фолтын опера „Галька" апынулася ў рэпертуары некалькіх тэатраў у свеце.

Кампазітара інспіравалі народныя песні. У лісце да свайго прыяцеля Манюшка пісаў, што „апошнім часам не працуе творча, а толькі вандруе па польскіх землях, натхняецца духам народных песень і з іх міжвольна пералівае натхненне ўва ўсе свае плады". І сапраўды, Манюшка дакладна вывучыў фальклор, не толькі польскі. Вучань кампазітара А. Іванскі ўспамінаў, што ў Смаргоні маэстра паклікаў яго ў карчму паглядзець беларускі танец. Такім вось чынам Манюшка знаёміўся з народнымі легендамі, песнямі і танцамі. І хаця ў кампазітара наватарства не было, яго значэнне ў гісторыі польскай музыкі — аграмаднае: стварыў ён мастацтва, у аснове якога ляжаць цудоўная меладычная вынаходлівасць, надзейнае сцэнічнае пачуццё і драматургічны інстынкт.

Аб вышэйзгаданых і іншых справах, звязаных з творчасцю Станіслава Манюшкі, дыскутавалі гісторыкі мастацтва і тэатра, музыколагі, харэографы, сцэнографы і музычныя крытыкі на канферэнцыі „Манюшка, якога не ведаем", якая адбылася 8-9 лістапада мінулага года ў Музеі незалежнасці ў Варшаве. Прафесар Яніна Панятоўская з Варшаўскага універсітэта зачытала даклад „Аб нацыянальнасці ў польскай музыцы XIX стагоддзя". Адзначыла яна, што духовую спадчыну ўсіх этнічных груп, якія раней жылі на тэрыторыі І Рэчы Паспалітай, польская інтэлігенцыя, улічваючы інтэгруючую ролю гэтай спадчыны ў падтрыманні нацыянальнай тоеснасці палякаў, успрымала як сваю ўласную. З другога боку літоўскі, беларускі і ўкраінскі народы ў імкненні да дзяржаўнай эмансіпацыі і ў пошуках гістарычна-культурных каранёў таксама стараліся захаваць гэтыя дасягненні пры сабе.

У выпадку Станіслава Манюшкі беларускія даследчыкі сцвярджаюць (напрыклад, Яўген Мірановіч у „Гісторыі Беларусі"), што свае найбольш вядомыя творы напісаў ён на аснове беларускіх песень і народных мелодый. Вядома таксама, што пасля пераезду на пастаяннае жыхарства ў Варшаву Манюшка падтрымоўваў сяброўскія і творчыя кантакты з беларускімі творцамі, напрыклад, з Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам.

Вечарам першага дня сесіі яе ўдзельнікі паглядзелі спектакль „Жарт у польскай песні" ў выкананні вучняў вакальнага аддзялення Комплексу дзяржаўных школ імя Ф. Шапэна і ў рэжысуры Яна Младаўскага.

На другі дзень адбылася дыскусія за круглым сталом на тэму „Манюшка на благі і добры час". Удзельнікі дыскусіі, якую вяла Малгажата Камароўская з Музычнай акадэміі імя Ф. Шапэна, наракалі на недахоп выданняў з творамі Манюшкі, у тым ліку „Хатніх спеўнікаў", абвінавачваючы ў гэтым Польскае дзяржаўнае музычнае выдавецтва. Прапанавалі яны выданне твораў кампазітара ў кніжнай форме і ў выглядзе кампакт-дыскаў і аўдыёкасет па цэнах даступных кожнаму аматару музыкі. Пры нагодзе дасталася таксама Польскаму радыё за абыякавасць да камплектавання і эмісіі запісаў твораў Манюшкі.

Шмат рознагалоссяў выклікала пастаноўка оперы „Страшны двор" у Вялікім тэатры ў Варшаве. Гледачы і крытыкі адмоўна ацанілі спробу перанесці акцыю оперы ў наш час. Выступоўцы адзначалі, што Манюшка пісаў оперу „для падтрымання духа" палякаў пасля паражэння Студзеньскага паўстання 1863 г. Пры гэтай нагодзе адбылася дыскусія на тэму сучаснасці ў мастацтве.

Круглы стол завяршыўся выступленнем прадстаўніка Варшаўскага таварыства імя Станіслава Манюшкі на тэму візіту ў Беларусь. Паведаміў ён, што ва Убелі пад Мінскам, дзе нарадзіўся кампазітар, на месцы колішняга дворыка сям'і Манюшкаў стаіць толькі абеліск з мемарыяльнай дошкай. Надпіс на ёй на беларускай мове інфармуе, што ў гэтым месцы нарадзіўся польскі кампазітар. А ў мясцовай школе знаходзіцца клас-музей у гонар Станіслава Манюшкі.

Вечарам другога дня ўдзельнікі канферэнцыі паглядзелі тэатральны спектакль „Латэрый" у рэжысуры Ганны Хайнацкай і ў выкананні вучняў Комплексу дзяржаўных школ імя Ф. Шапэна.

Міхал Занчэўскі

Зорка

старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

І „ц” клас бельскай „тройкі”

Умеюць бараніць сваё!

Пра І „ц” клас, што ў бельскай „тройцы”, настаўніца беларускай мовы Валянціна Бабулевіч сказала так:

— Гэты клас мне падабаецца. Многія гімназісты маюць свае думкі і погляды. І яны — што самае каштоўнае — умеюць бараніць сваё!

Гімназісты-першакласнікі пакуль знаёмяцца між сабой. Не ўсе раней вучыліся разам. Тут 26 асоб, выхавацелькай класа Аліна Якубюк.

— Наш клас найфайнейшы, — кажа гаваркая Магда, — нам разам весела і цікава.

Сярод выдатнікаў гімназісты назвалі Марту Федарук. Марта прымала ўжо ўдзел у трох прадметных конкурсах: матэматычным, гуманістычным (польская мова і гісторыя) і беларускай мовы. Марта — лаўрэатка ў конкурсе беларускай мовы. Таксама ў гуманістычным конкурсе яна перайшла ў другі этап.

Нашы сябры ахвотна ўдзельнічалі ў дэкламатарскім конкурсе „Роднае слова”. Сярод лаўрэатаў апынуліся: Марта Федарук, Галена Шмытдкі і Марта Бабулевіч.

З другога класа бельскія навучэнцы чытаюць „Зорку”. Тут вядомыя нашым чытачам карэспандэнты: Марта Федарук, Аня Нікалаюк, Міхась Матэнька.

Варта дадаць, што сярод лаўрэатаў у конкурсе крыжаванак, вельмі часта з'яўлялася наша Марта Федарук.

Зорка

Дзённік Міколы

Рыжыя, на літару „М”

Падарожжа ў Краіну Гот я ўспамінаў як сон. Мае сябры, здаецца, таксама. Аня ў канцы прачнулася. У суботу раніцай мы сустрэліся каля пад'езда. Аня пачаставала нас дзіўнай навінай:

— Калі мы прабывалі ў Краіне Гот, у нашай камяніцы пасяліліся новыя жыхары.

— Зноў! — усклікнуў я.

— Не бойся, гэта не Ліняцкія, — сказала яна.

— Ты, іх ведаеш?

— Так, я ўжо сустрэлася з імі. Учора яны завіталі ў госці да маіх бацькоў. Мая мама не можа перастаць гаварыць пра нашых новых суседзяў. Яны такія цудоўныя.

— А можа гэта Ліняцкія? Змянілі свой выгляд, каб зноў зачароўваць наш дом, — падкінуў думку Тамаш. — Яны, здаецца, маюць тут яшчэ свае разборкі.

— Кіньце гэту казку! Нашы новыя суседзі вельмі сімпатычныя людзі, — абурылася Аня.

— Яны, усе напачатку сімпатычныя, — пракаментаваў Тамаш. Усе мы баяліся аднаго — калі Аня пачынала нечым захапляцца, нам успамінаўся хлус-кант. Аднак, Аня перамагла. Яна зацікавіла нас „новымі”.

— У сям'і чацвёра дзяцей: Міхась, Марта, Максім і Мілаш. І ўсе яны маюць рыжыя валасы.

— О, не! — крыкнуў Тамаш. — Усе маюць імёны на „М” і ўсе рыжыя. Гэта ж... незвычайнае. І, пэўна, яшчэ ў іх рыжы кот? Звар'яцею!

— Вар'яцей! — кінула Аня. — Вар'яцей! У цябе няма іншага выхаду. Ты, коцік, не ўмееш новай гісторыі пабачыць асобна, табе ўсё павінна спалучацца з папярэднім, зліваццa адно з адным. Віншую, ты на добрай дарозе, каб з'ехаць з глузду!

Аня гаварыла, а мы паціху думалі, што хлус-кант сапраўды многаму навучыў нашу сяброўку.

— Нам неабходна з імі пазнаёміцца, — прапанаваў я. — Пагутарым, пагуляем з іхнім коцікам...

І мы ўсе рушылі ў кватэру новых сяброў.

— Як добра пойдзе, — прапанаваў Томак, — то разам сходзім у кіно. Ад учора ў нашым горадзе паказваюць „Гары Потэра і Пакой таемнасці”.

— Супер! — пагадзіліся мы. Трэба вам ведаць, што ў суботу ў кіно ў нашым горадзе пускаюць дарма.

(працяг будзе)

(нак-с)

Вершы Віктара Шведа

Знайшоў выхад

Запытаў матулю Яцэк:
— Ці маеш нейкую мне працу?
Адказвае на гэта матка:
— Не маю для цябе занятку.

— Патрэбныя мне грошы, мама,
Сёння іду ў кіно з Адамам.
Не маеш працы — дык нічога,
Дай беспрацоўнаму ўспамогу.

На школьнай забаве

Вучань на школьнай забаве
Просіць да танца паню:
Азвалася так неласкава:
— З дзяцьмі не танцую я, Ваня.

Іван па адмове гэтай
Звярнуўся да сябра Сашы:
— Скажу я табе па сакрэце:
Цяжарная пані наша.

Сінічка

— Ай, наша ты сінічка! — глядзіць на ўнучку Аксанку баба Гандзя. Бабуля Гандзя гэта „бабка-маладая”, як яе называе Аксанка. Яна яшчэ ходзіць на працу, як і Аксанчына мама. Мама Аксанкі Мілка працуе ў школе, а бабка Гандзя — у бібліятэцы. А яшчэ ёсць у Аксанкі „бабуля-старушка”, бабуліна мама. Яна на працу ўжо даўно не ходзіць. Як даўно, Аксанка не ведае. Яна заўсёды ў Аксанкі дома, ад яе нараджэння. Бабуля Маня ўжо ўвогуле не дае рады хадзіць. Яна ездзіць на калясцы, сядзіць на ложку альбо на спецыяльным крэсле. З бабай Маняй добра Аксанцы — у яе шмат часу. Толькі часта падрэмвае — усе бабулі-старушкі любяць удзень спаць, а ноччу ім заснуць цяжка.

— Што ты, бабця Маня, ноччу робіш, калі мы спім? — пытаецца ў прабабулі Мані дзяўчынка. І ведае, што бабуля скажа праўду, і не ўцячэ ад яе да нейкіх сваіх заняткаў, бо, як кажа, нарабілася за ўсё жыццё.

— Успамінаю. І сніцца мне сон наяве.

— Гэта як фільм?

— Ах ты, наша сінічка, праўда, як фільм.

— А ты добра, бубуля, чуеш, калі нам тэлевізар уключаны? Ты часам спіш, сама бачыла — акуляры з носа ўпалі... А, можа, твой сон-фільм больш цікавы, чым той у тэлевізары.

— Аксанка, сінічка, дай крыху бабцы Мані перадыхнуць! — смяецца бабціна дачка, бабуля Гандзя.

— А што, дыхаць цяжка? Гэта тады, як набегаешся, задыхаешся. А бабця сядзіць або сабе ездзіць на калясцы. Давай, бабця, я цябе паважу. Па-аехалі ў другі пакой!

Папхнула-пакаціла бабуліну каляску Аксанка. Цяжкавата, як на чатыры гады. Аж стукнуліся з імпэтам у шафу.

— Што вы робіце, дзяўчаты! Яшчэ ў аварыю трапіце! — смяецца Аксанчын тата Андрэй.

Селі абедаць. Добра ў нядзелю — усе разам за сталом. А сінічка-Аксанка прыладжваецца каля прабабулінага крэсла.

— Татулька, глянь: бабулі завысока. Есці нявыгадна. Трэба ножкі ў крэсле падрэзаць крышку! — і пабегла малеча ў каморку, па пілу-нажоўку: — Бяры, тата, раўняй ножкі ў бабуліным крэсле.

— Вось наша сінічка — ціўкае ды ціўкае! — цешыцца сям'я.

Міра Лукша

Узяў гітару і спадабалася!

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

З Тамашом СУЛІМАМ, лаўрэатам конкурсу „Бардаўская восень 2002”, гутараць бельскія гімназісткі: Эвеліна Карчэўская, Мілена Парфянюк, Дар’я Нікалаюк і Анна Манцюк.

— Што для цябе значыць музыка?

— Не магу сабе ўявіць даўжэйшай хвіліны без музыкі, якую люблю. Гэта штосьці, што займае мне многа часу.

— Што спрычынілася да таго, што ты ўдзельнічаў у „Бардаўскай восені”?

— Магчымасць здзейсніцца. Я хацеў пабачыць і адчуць, як гэта ёсць, калі выступаеш на сцэне. Можа, ціха, глыбока ў душы думаў, каб стаць музыкам? Упершыню мне вельмі падабалася гэтае іграннe на гітары, сустрэчы з людзьмі. Пасля першага выступлення на сцэне я стаў больш упэўненым у жыцці. У мінулым годзе было зусім інакш. Аднак, меў я дасведчанне, выступаў на сцэне. Здаецца мне, што гэтае выступленне было горшае.

— Ці не здзівіла цябе, што быў ты адзіным прадстаўніком Падляшша?

— На Падляшшы пражывае 100 тысяч беларусаў, у тым я, а ў Беларусі — 10 мільёнаў, і тое, што з Беларусі было больш удзельнікаў, не здзівіла мяне. Тое, што я выступаў з Падляшша, лічу поспехам. Музыка бардаў і паэзія не надта папулярныя сярод беларусаў Падляшша. Няма ахвотных на такую музыку. Можа калісьці былі. Цяпер не бачу іх.

— Доўга ты рыхтаваўся да конкурсу?

— Да першага выступлення я рыхтаваўся доўга, амаль год. Думка, каб выступіць, з’явілася ў снежні 2000 года. Песні і музыка паяўляліся самыя. Цяпер я таксама меў год, але рэпертуар быў падабраны паўгода раней. Аднак сапраўдная падрыхтоўка пачалася месяц да выступлення.

Фота з архіва ТАМАША СУЛІМЫ

— Чаму ты запрасіў да свайго выступлення Алега Кабзара?

— Алег — гэта мой добры сябра. Падабаецца мне ягоны погляд на музыку, на мастацтва. Ведаў, што будзе пасаваць мне флейта, на якой іграе Алег. Хачу з ім супрацоўнічаць, мабыць, узнікне нейкі гурт ці дуэт.

— Ці здзівіла цябе рашэнне журы і высокая ўзнагарода — магчымасць запісу сваіх твораў у прафесійнай студыі Радыё Беласток?

— Пасля гэтага выступлення я сцвердзіў, што было яно апошнім. Многае мне не спадабалася. Наступнага дня ў гасцініцы сустрэўся я з адным членам журы і ён сказаў, што буду мець магчымасць запісаць свае песні. Спачатку я не верыў, але ўзнагароду атрымаў.

— Калі пачнеш запісваць кампакт-дыск, калі ён паявіцца, і ў якім будзе клімаце?

— Мой час на запіс дыску — гэта паўгода. Магчыма, зраблю гэта ў час зімовых канікулаў. Цяжка сказаць які будзе клімат. У першай чарзе будзе паэзія. Месцамі можа штосьці мацнейшае, думаю аб электрычных гітарах да некалькіх твораў.

— На якой мове будуць творы? І ці будуць там твае песні з конкурсу?

— На сённяшні дзень думаю, што ўсё будзе на беларускай мове. Хачу яшчэ памясціць разам песні Алега.

— Як ацэньваеш іншых удзельнікаў конкурсу і ўзровень мерапрыемства?

— Чуў я, што летась узровень быў нізкі. Цяжка сказаць, ці ён быў нізкі, але, здаецца мне, што аднак быў ніжэйшы, чым у мінулых гадах. Выступленне дзяўчыны, якая атрымала галоўную ўзнагароду, спадабалася мне. Здаецца, яна была з нас найлепшая. Добры быў „Дуэт 48” з Мінска. З імі я таксама пасябраваў. Падабаецца мне, што ў Беларусі ёсць людзі, якія хочуць спяваць па-беларуску.

— Ці твае творы аўтарскія?

— Палова тэкстаў — мая, або гэта мае другое „я”. Другая частка — гэта творы беларускага паэта Адама Глёбуса. Бывае так, што пішацца праз адну ноч, некалькі гадзін. Цяпер ёсць так, што пішу тры або чатыры творы. Пішу ўжо два месяцы і не ведаю, які будзе іх лёс — або спалю, або закончу. Музыка прыходзіць сама.

— Якія тэмы пераважаюць у тваіх творах?

— Спяваю аб каханні. Не, гэта жарт. Аднак кахання можна дашукацца. Тэма твораў — гэта справа пераходная, гэта штуршок да таго, што хачу пераказаць. Песні можна ўспрымаць літаральна, альбо ў пераносным значэнні. Хачу, каб кожны ўспрымаў па-свойму.

— Ці доўга ўжо іграеш на гітары, бо мы не памятаем, каб ты выступаў у Пачатковай школе?

— Добра памятаю, гэта было тры гады таму. Узяў гітару ў рукі, спадабалася і так пачаў іграць. Я музычны самавук. Успрымаю гэта як гульню.

Фота з архіва ТАМАША СУЛІМЫ

— Твая цяга да музыкі не перашкаджае ў вучобе?

— Можна было б заглянуць у мой дзённік і пабачыць мае ацэнкі. Гэта нармальна, што ў нейкі спосаб перашкаджае. Калі маю ў руках гітару, а не кніжку, дык гэта, паводле настаўнікаў, страта часу. Каб вучыцца, патрабую свабоднага часу для сябе. Не магу вучыцца так, каб не мог рабіць тое што люблю.

— Ці будзеш удзельнічаць у конкурсе ў будучыні?

— Хачу сказаць, што ў наступным годзе не будзе конкурсу, бо будзе юбілей. А ў будучыні, цяжка сказаць. Я ўжо лаўрэат і ў конкурсе мне не трэба ўдзельнічаць.

— Якія ў цябе зацікаўленні апрача музыкі?

— Я малады чалавек і ў мяне шмат зацікаўленняў. Люблю кіно, тэатр. Люблю есці, спаць. Я вельмі лянівы, але і страшэнны пасіянат. Як знайду штосьці цікавае, то буду тым займацца без перапынку. Такі ўжо я!

— Дзякуем за размову.

Польска-беларуская крыжаванка № 4

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 52: Курс, ток, вол, лязо, апал, кніжка, трава, продак, лірыка, ял. Колас, сто, тры, крок, кананада, піва, важак, толк, анёл.

Узнагароды, **аўтаручкі**, выйгралі: **Кацярына Сіроцкая**, **Ева Янцэвіч** і **Паўліна Мартынюк** з Новага Корніна, **Кацярына Сідарук** з Гайнаўкі, **Альжбета Антанюк** з Арэшкава. Віншуем!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Вольга Анацік (злева) і Марыя Манаховіч

Плён VII Агульнапольскага конкурсу паэзіі і прозы

Марыя Манаховіч

Мяцеліца

Разгулялася свавольная,
вясёлая мяцеліца.
Снег пушысты ў вочы сыпле,
пад ногі нам сцелецца.
Вецер вее, завывае,
сняжок падымае,
круціць яго ў паветры
і ўсё, усё раўняе.
Замецены сляды птушак
і сляды звярыны,
занесены ўсе сцяжынкі
і ўсе каляіны.
А мяцеліца бушуе,
мяце і гуляе,
засыпае снегам вочы,
слабых з ног збівае.

Вольга Анацік

Крук птушак ганяе

Ляціць крук
Каркае над палямі
І ўсё махае
Чорнымі крыламі.
Ой круку, круку,
Ты добра знаеш,
Ляціш нізенька,
Есці шукаеш.
А сам вялікі,
Крылы раскідае,
Дзе многа птушак,
Ён іх ганяе.
Птушкі баяцца,
Крука ўжо знаюць
І як найдалей
Хутчэй адлятаюць.

Калядкі ў Бельску

„Пятніца — 10 студзеня, 17 гадзіна, Бельскі дом культуры", — такія словы можна было пачуць у пачатку студзеня ў бельскіх цэрквах і касцёлах. Да гэтага два, можа тры, рэкламныя плакаты ў цэнтры горада з інфармацыяй аб супольным канцэрце калядных песень у выкананні праваслаўных і каталіцкіх хораў.

Мерапрыемства ў Бельску ладзілася ўжо трынаццаты раз і прыцягнула ўвагу жыхароў не толькі горада, але і навакольных вёсак. За пятнаццаць хвілін да канцэрта зал быў набіты бітком. Не толькі не было дзе сесці, але і стаяць не было як!

Канцэрт пачаўся супольным спяваннем дзвюх калядак: „Ціхая ноч" на польскай мове і „Неба і земля" — на беларускай. Прымала ў ім ўдзел дзевяць хораў і калядныя групы гурту „Маланка" і калектыву „Маці Божай Каспераўскай" з Відава. Апошні, хаця існуе ад нядаўна, вельмі спадабаўся публіцы. Яны першымі паявіліся на сцэне з гвяздай і прывіталі публіку старадаўнім, калядным звычаем: „Мы прыйшлі Хрыста славіті, ваш дом вэсэліті! Можна співаті? Чы не?" Публіка голасна адказала : „Співайтэ!" Ды і заспявалі. Сямнаццаць чалавек, у тым ліку дзеці і старэйшыя жыхары Відава, якія звычайна спяваюць у царкоўным хоры пад кіраўніцтвам Дарафея Фіёніка, паказалі высокі ўзровень выканання. „Воны то з сэрцом заспівалі, так по-нашому", — гаварылі людзі пасля канцэрта.

Публіка гучнымі апладысментамі ўзнагародзіла выступленне 20-асабовага хору Міхайлаўскай царквы пад кіраўніцтвам Ірэны Каравай.

Маладзейшым удзельнікам Калядна-га вечара спадабалася выступленне камернага хора „Канто", які ў прафесіянальным стылі заспяваў калядкі на польскай, англійскай і лацінскай мовах, але самым цудоўным было выкананне нашай калядкі „Ціхая ноч над Палясцінай".

„Гэн высоко", „Ангелы ў небе", „Дзіўная навіна", „Добры вечар", „Нова радасць стала", „Ціхая ноч", „Прадвечны Божа" — гэта толькі некаторыя з калядак, якія можна было пачуць у Бельскім доме культуры. Хай шкадуе, хто не быў на канцэрце!

Паўліна Шафран

Немцы пішуць пра Беларусь

Выйшла ў свет брашура „10 гадоў германа-беларускіх адносінаў", падрыхтаваная выкладчыкамі ДААД (Германскай службы акадэмічных абменаў) і Фонду імя Робэрта Боша, а таксама супрацоўнікамі Федэральнага міністэрства замежных спраў. Аўтары выдання адзначаюць, што ні Еўрапейскі Саюз, ні Германія не зацікаўлены ў ізаляцыі Беларусі і гатовы да сур'ёзнага дыялогу датычна паэтапнай нармалізацыі стасункаў. Пры гэтым Еўрасаюз чакае ад афіцыйнага Мінска захавання міжнародна прызнаных асноўных каштоўнасцей і прынцыпаў.

Працягам брашуры „10 гадоў германа-беларускіх адносінаў" стане кніга „Адкрываем Беларусь для немцаў", якую пішуць 60 вучоных з розных беларускіх універсітэтаў. Гэтая кніга выйдзе на пачатку 2003 года пад эгідай амбасады ФРГ у Мінску.

http://racyja.promedia.by

Паэтычныя песні бардаў

Агарні глыбіню сваім голасам

Што такое бардаўскія супер-гіты? Назаву толькі адзін — „Запяі мне песню", — і Вы адразу зразумееце, пра што ідзе гаворка. Гэты твор гамяльчанкі Вальжыны Цярэшчанкі на вершы Ларысы Геніюш слушна лічыцца не толькі гітам, а нават своеасаблівым эталонам жанру.

Як сказана ў буклеце выдання, сюды ўвайшлі канцэртныя (гукарэжысёр Ю. Гусакоў) і студыйныя (гукарэжысёр В. Бяляеў) запісы розных гадоў — ад 1991 да 1996. Але ўжо ў 1989-м, калі я быў у Канадзе, са мною здарыўся адзін характэрны выпадак.

З пісьменнікам Кастусём Акулам мы сабраліся ў падарожжа на Ніягарскі вадаспад. Гаваркі шафёр дыхтоўнага „Б'юіка" даведаўшыся, што ў машыне госць з Беларусі, вырашыў мяне здзівіць: „У Вас там такія таленты, — кажа, — а Вы іх нават не ведаеце. Вось, паслухайце". У стэрэасістэме машыны адразу і загучала „Запяі мне песню".

Але для мяне гэта не было надзвычайным адкрыццём, бо адкрыў я яго яшчэ за год перад тым на канцэрце ў... Віленскай школе імя Мікалоюса Чурлёніса. Калі я назваў імя Вальжыны Цярэшчанкі, дык і шафёр праявіў здагадлівасць: „Вы, відаць, прафесійна займаецеся музычнай крытыкай. Але мала ведаць такі Божы дар, трэба рабіць усё, каб яго ведалі людзі".

І вось ужо творы Вальжыны Цярэшчанкі выходзяць масавым накладам на дыхтоўных альбомах і МС-зборках.

Два дзесяткі самых разнастайных твораў унікальнай бардэсы з Гомеля ўвайшлі ў гэты збор. А творчая палітра спадарыні Вальжыны аж стракаціць фарбамі: яна і спеўная паэтка ў песнях „Жаданне", „Бюракрату з Дома Ураду", у сваім перакладзе „Абэ, Ойча!", яна і чулы песенны інтэрпрэтатар класічнай паэзіі ў творах на вершы Я. Купалы, А. Гаруна, Л. Геніюш, У. Жылкі, Я. Чачота, яна і папулярызатар творчасці сваіх сучаснікаў (А. Сыс, В. Куртаніч, Зьніч).

Музычная адукацыя цяперашняга філолага В. Цярэшчанкі выразна праступае ў многіх ейных бардаўскіх творах, але самымі геніяльнымі апынуліся, бадай, не толькі „Запяі...", але і „Раманс аб расстраляным каханні" (У. Караткевіч), „Айчына-Радзіма" (А. Барскі) і шэраг іншых. Самыя мелодыі вартыя пяра Агінскага або Манюшкі, а разам з непаўторнай паэзіяй і цудоўным голасам Вальжыны ствараюць вартасны ўзор беларускага песеннага пантэона.

Нас лёс сутыкнуў у далёкай краіне,
І ўспомніў я край свой прыгожы і шчыры,
Як сыны ўспамінаюць Маці-Радзіму,
Яе неабсяжныя родныя шыры.
Айчына-Радзіма, а мы — твае дзеці.
Хто здрадзіў табе, не можа быць сынам.
Хай кідае лёс нас па ўсім белым свеце,
Ды мы цябе, краю, ніколі не кінем.

Мала таго, што словы кранальныя, а як гучыць мелодыя і далікатны голас Вальжыны, нават у закаранелага чарсцвяка да горла камяк падступае, а ў многіх слухачоў я сам бачыў жывыя слёзы на вачах. І вось з такіх геніяльных шэдэўраў пераважна і складаецца гэты песенны збор. Амаль гадзіна слухання ні на хвіліну не прынясе расчаравання, а толькі радасць подзіву шэдэўрам, натхненне якім пэўна даў сам Бог. Той, да каго спявачка звяртаецца ў пранікнёнай малітве „Абэ, Ойча", якую ў шматлікіх вандроўках спявала разам з паломнікамі на розных мовах ды нарэшце сама пераклала на беларускую. Той, да каго звяртаецца пранікнёнымі словамі Уладзіміра Жылкі „Падарожным, Божанька, ды нялёгка йсці" або незабыўнай малітвай Ларысы Геніюш „Божа адзіны — мой Ойча з нябёс, другога на свеце не маю".

З уласных паэтычных экзэрсісаў В. Цярэшчанкі многія даследчыкі адзначаюць тонкую лірыку „Жадання", дзе ёсць не толькі вобразныя знаходкі, але і словатворчае наватарства:

Падаруй мне вачэй тваіх ноч,
Каб мяне агарнула ўсю,
Падаруй сваіх вейкаў ***млоч****,*
Каб застацца ў ёй не на пакуль.

Цікава, колькі я ні сачыў пільна за творчасцю Вальжыны, збіраючы самаробныя запісы з канцэртаў у Гомелі, Мінску, Вільні, Беластоку, але ў новым аўдыёзборніку знайшлася і для мяне неспадзяванка — цыганская песня „Bryczka meczorame" на мове арыгінала. Прызнаюся, вельмі ўразіў мяне гэты каларытны фальклорны трэк, але, па шчырасці, не здзівіў, бо здаўна чуў спевы Вальжыны не толькі на беларускай, але і на польскай, іспанскай мовах, нават на латыні. Дык чаму не заспяваць на мове адной з этнічных груп Беларусі?

Фундатарам і рэалізатарам ідэі выдання гэтага змястоўнага збору твораў геніяльнай беларускай бардэсы зноў выступіў вядомы прадзюсар Кастусь Елісееў. А ў сваёй мастацкай аздобе ён скарыстаў каларытны здымак Уладзіміра Панады, зроблены ў садзе пры сядзібе сям'і Куртаніч у Мінску.

Вітаўт Мартыненка

Заснавалі Таварыства любіцеляў Нараўчанскай зямлі

У Гмінным асяродку культуры ў Нараўцы адбыўся сход, на якім заснавалі Таварыства любіцеляў Нараўчанскай зямлі. Прынялі ў ім удзел не толькі жыхары Нараўчанскай гміны, але і выхадцы ў Беласток, Гайнаўку, Варшаву, Люблін і Лодзь. Разам 37 чалавек. Старшынёю Таварыства выбралі Вольгу Зданоўскую-Місяюк, а ў склад праўлення: Анну Стульгіс, Тадэвуша Крыжанскага, Андрэя Крышаня і Алімпію Павільч. У склад рэвізійнай камісіі ўвайшлі: Анна Мілько, Анна Харкевіч і Андрэй Длугалэнцкі. ТЛНЗ прымае ў свае рады новых членаў, творчых людзей, актывістаў. З гэтым трэба звярнуцца да члена праўлення Алімпіі Павільч. Таварыства мае багатую праграму дзейнасці ў карысць малой айчыны. Неўзабаве наладзіць сяброўскую сустрэчу любіцеляў Нараўчанскай зямлі, далучыць да арганізавання рэгіянальнага музея ў Нараўцы, а таксама да выставак прац мясцовых творцаў-аматараў і, па меры сваіх магчымасцей, зоймецца выдавецкай дзейнасцю (публікацыяй мясцовых фальклорных песень, легенд і паданняў). (яц)

Папраўка

У 1 (2434) нумары „Нівы" ў артыкуле „Культурны каляндар" няправільна было запісана прозвішча спадарыні **Тэрэсы Пардо**. Прашу прабачэння.

Мацей Халадоўскі

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Муравана-каменны масток з пачатку XX ст. у канцы Орлі пад дарогай у Рудуты

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Крыж у Малінніках

Помнікі мінуўшчыны ў Арлянскай гміне

Народ існуе датуль, дакуль яго мінуўшчына безупынна, пры дапамозе сучаснасці, сутыкаецца з будучынёй — пісаў Адам Міцкевіч. Запаведнікі з'яўляюцца матэрыяльнымі сведкамі гістарычнага трывання народа. Гэта доказы яго працавітасці і мастацкага дару, захапленняў нашых продкаў і сведчанне варункаў іх жыцця; яны ўвабралі ў сябе багаты змест.

Помнікам мінулага можа быць і гарадскі квартал, і асобны будынак або яго частка, і скульптура, і карціна, і гліняны гаршчок, у якім нашы продкі трымалі ваду. Можа ім быць таксама дрэва або збор дрэў ці іншы каштоўны ў гістарычным, мастацкім або навуковым плане аб'ект. У Польшчы кожны такі аб'ект запісаны ў рэгістр запаведнікаў і ахоўваецца законам. Усе работы ў такіх аб'ектах і ў іх сутычным наваколлі можна праводзіць толькі з дазволу ваяводскага рэстаўратара запаведнікаў.

У Арлянскай гміне такіх аб'ектаў за дзесяць, у іх ліку культавыя і могілкавыя комплексы:

1. урбаністычная кампазіцыя Орлі, 16-17 ст.;
2. праваслаўны царкоўны комплекс у Орлі:
   а) драўняная царква, 1796 г.,
   б) драўняная званіца, 1800 г.;
3. драўняная могільнікавая царква ў Орлі, 1868 г.;
4. мураваная бажніца ў Орлі, 2 пал. 18 ст.;
5. тры падзямельныя водаправодныя канавы ўпоперак дарогі між Орляй і Рудутамі, пач. 20 ст. (на здымку);
6. праваслаўныя могілкі ў Орлі, канец 18 ст.;
7. комплекс праваслаўных могілак у Паўлінове:
   а) мураваная грабніца Шульцаў, 1904 г.,
   б) могілкі, 19 ст.;
8. праваслаўны царкоўны комплекс у Шчытах-Дзенцялове:
   а) драўняна-мураваная царква, 1785 г., дабудаваная к. 1850 г.,
   б) драўняная званіца, 1785 г.,
   в) муравана-каменная статуя Яна Непамука, 1758 г.;
9. драўняны двор у Шчытах-Навадворах, 19 ст.;
10. прыватная драўняная хата ў Москаўцах, 1904 г.

Апрача пералічаных у спіску падляшскага рэстаўратара запаведнікаў ёсць яшчэ каля дваццаці аб'ектаў з тэрыторыі Арлянскай гміны, якія не запісаны ў рэгістр помнікаў, але маюць запаведную каштоўнасць і ахоплены сферай зацікаўлення рэстаўратара. Гэта ў першую чаргу старыя хаты, загарады, некаторыя пасляшкольныя будынкі, капліца ў Градалях і царква ў Вульцы-Выгаоўскай.

На тэрыторыі гміны яшчэ ёсць не запісаныя ў рэгістр запаведныя могілкі, якія павінны быць ахоплены аховай. Да іх ліку належаць яўрэйскія могілкі ў Орлі, нямецкія могілкі перыяду першай сусветнай вайны ў Рыгораўцах і праваслаўныя могілкі ў Чахах-Забалотных, Рыгораўцах, Кашалях, Кошках, Рудутах, Малінніках, Спічках, Шчытах-Дзенцялове, Шарнях, Тапчыкалах і Вульцы-Выгаоўскай. Варта таксама пацікавіцца своеасаблівымі прыдарожнымі крыжамі на расхадных дарогах і ў канцах вёсак.

Пашану для продкаў і іх спадчыны трэба ўзгадоўваць у кожным маладым пакаленні. На жаль, у нас стаяць запаведнікі, якія на нашых вачах беспаваротна абарочваюцца ў руіну. Суцяшае і абнадзейвае тое, што некаторыя з іх „даспяваюць" для прызнання іх каштоўнымі сведчаннямі нашай культуры і гісторыі. Час плыве і нядаўняя сучаснасць з яе здзяйсненнямі становіцца гісторыяй з запаведнікамі. На месца заняпадаючых старых помнікаў мінуўшчыны прыходзяць і будуць прыходзіць іх чарговыя пакаленні.

Міхал Мінцэвіч

Беласточчына — Гродзеншчыне

У Гродзенскую вобласць паступіў гуманітарны груз, сабраны Беластоцкім праваслаўным цэнтрам міласэрнасці „Элеас", паведаміла прэс-служба Міністэрства замежных спраў Беларусі. Частка яго — вопратка, цацкі і цукеркі — накіраваны ў дзіцячы дом горада Ліда, другая частка — у жаночы манастыр Нараджэння Прасвятой Багародзіцы.

Такая гуманітарная дапамога для дзяцей і праваслаўных вернікаў Гродзенскай вобласці штогод арганізуецца па ініцыятыве кіраўніка цэнтра „Элеас" Марка Масальскага, які таксама з'яўляецца намеснікам старшыні Гарадской рады Беластока. У 2003 г., паведамляе прэс-служба, „Элеас" плануе адпраўку ў Беларусь яшчэ адной партыі гуманітарнай дапамогі ад праваслаўных вернікаў Польшчы.

„Биржа информации", 16.01.2003 г.

Душу — на рэгістрацыю

Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь распачаў падрыхтоўку да перарэгістрацыі ўсіх рэлігійных арганізацый.

У Беларусі налічваецца 2 830 рэлігійных абшчын: 1 261 праваслаўная, 434 рымска-каталіцкія, 272 хрысціян-баптыстаў, 494 хрысціян веры евангельскай, 56 адвентыстаў і г.д. Усе яны прадстаўляюць 26 рэлігійных канфесій. Апрача абшчын, перарэгістравацца мусяць і 152 рэлігійныя аб'яднанні: епархіі, манастыры і г.д. У Беларусі налічваецца 10 праваслаўных і 4 рымска-каталіцкія епархіі.

http://racyja.promedia.by

Аб Святой Зямлі

У канцы 2002 года Брацтва праваслаўнай моладзі арганізавала ў Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы спатканне з протаіерэем Васіліем Шклярукам, які расказаў вучням пра паездку ў Святую Зямлю.

Найбольш часу гаварыў ён аб Магіле Гасподняй (на здымку), каля якой былі паломнікі з Беласточчыны. Вернікі з Гайнаўкі прысутнічалі ў Базіліцы Магілы Гасподняй у час сашэсця Святога Агню, якое адбываецца толькі перад святкаваннем праваслаўнымі Уваскрэсення Гасподняга. Айцец Васілій чакаў гэтага здарэння амаль цэлыя суткі. Толькі некалькі гадзін адпачываў седзячы і мусіў адступіць з блізкага ад магілы месца, калі займалі яго грэчаскія паломнікі. Здзівілі святара спевы і крыкі некаторых паломнікаў, якія ўголас маліліся перад Магілай. Пасля малітваў патрыярха і вернікаў пачалі паяўляцца агні паміж царкоўнымі лампадамі і сышоў агонь у Магілу Гасподнюю. Сабраныя перадавалі яго і запальвалі купленыя ў Іерусаліме свечкі. Айцец Васілій дакрануўся тварам да агню і не адчуў гарачыні. Толькі праз нейкі час агонь пацяплеў. Запаленыя ў базіліцы свечкі паломнікі прывезлі ў Польшчу і раздалі вернікам.

Паломнікі з Беласточчыны былі каля месца распяцця Хрыста — Галгофы, Каменя Памазання, дзе цела Хрыста было рыхтаванае да пахавання, Капліцы знаходкі Крыжа Гасподняга, арганізавалі пешаходныя экскурсіі па Іерусаліме. Ездзілі пад Сінайскую гару і пяшком уваходзілі на яе, а пасля наведалі там Манастыр св. Кацярыны. Былі ў Віфлеемскай базіліцы Нараджэння Хрыстовага. Айцец Васілій паінфармаваў, што рымакаталіцкія манахі, аб якіх многа гаварылася ў польскім тэлебачанні пры нагодзе ізраільска-палесцінскага канфлікту, займаюць толькі частку будынкаў спалучаных з базілікай. Большая частка базілікі належыць праваслаўным, частку займаюць таксама армяне, аб чым не ўспаміналі польскія мас-медыі. Усе паломнікі купаліся ў Іардане і прывезлі яго ваду дамоў. Вернікі з Польшчы заўважылі вялікую разнароднасць ва ўмовах жыцця людзей, што знаходзіліся побач святых месцаў. Каля вялікіх гатэляў, новых рэстаранаў і багатых кварталаў гарадоў жывуць у палатках бедуіны, якія возяць галлё для падрыхтоўкі харчавання і начнога абагравання сваіх шалашоў. Давозяць ім у пустынныя месцы ваду і харчаванне. Протаіерэй Васілій Шклярук заахвочваў сабраных у саборы наведаць Святую Зямлю. Хаця зараз у Іерусаліме вядуцца ваенныя дзеянні, арганізуюцца туды паломніцтвы з Польшчы. Многа праваслаўных вернікаў з Расіі наведваюць зараз святыя месцы ў Іерусаліме.

Гайнаўская моладзь сустракаецца ў саборы па пятніцах. Спачатку вучні прымаюць удзел у богаслужэнні, у час якога чытаецца акафіст да Божай Маці перад яе іконай „Нечаканая радасць" або да мучаніка Гаўрыіла ў царкве прысвечанай Святым Зямлі Беларускай. Пасля вучні разам са сваім апекуном, іерэем Андрэем Буслоўскім спатыкаюцца ў сваім памяшканні, каб паразмаўляць аб сямейным, школьным і царкоўным жыцці. Зараз вучні збіраюць грошы, каб заказаць напісаную на дошцы ікону святому велікамучаніку Гаўрыілу. Дзеля гэтага перад Раджаствам Хрыстовым прадавалі ўпрыгожаныя хвоінай свечкі.

Аляксей Мароз

Тры гады прымусовай працы

Успаміны Яна ПАНАСЮКА, 78-гадовага жыхара вёскі Чаромха.

На прымусовыя работы ў Нямеччыну вывозілі ў 1942 годзе. На спіску апынуўся я з аднагодкамі: Сцяпанам Леўчуком, Верай і Любай Внучкамі, Любай Міркоўскай і Марфай Раманчук. Зборны пункт назначылі ў Бельску. Там на цягніку дабіраліся. Памясцілі нас у дзеравянай шопе, хлопцаў і дзяўчат у асобных перагародах. Ноч прайшла на чаканні. Ранкам пагрузілі ў таварныя вагоны і адправілі ва Усходнюю Прусію.

Выгружаліся ў Вормдыт. Затым пераехалі ў Гайльсберг. Завялі ў вялікую залу, дзе нямецкія гаспадары чакалі нас. Зала была перагароджана шкляной сцяною і змяшчалася там сцэна. Паставілі ў шарэнгу. Баўэры аглядалі нас і выбіралі. Перад тым перакладчык запытаў, хто што рабіў на гаспадарцы. Адных ставілі набок, для дагляду жывёлы, а іншых да працы ў гаспадарцы. Я нічога не сказаў і застаўся ў шарэнзе разам з астатнімі семярымі. Мяне выбрала маладая, гадоў пад трыццаць, немка. Пачаткова чыноўнік не хацеў ёй прызначыць работніка, але пасля спрэчкі жанчына перамагла. З немкай пайшлі на станцыю. На цягніку ў Ляунаў прыехалі. Маёнтак знаходзіўся каля паўтара кіламетра ад станцыі. Пехатою прыйшлі. Немка аказалася ветлівай спадарожніцай. Фрыдай яе клікалі. Жыла са старэнькімі бацькамі Юзэфам і Марыяй. Гаспадарку мелі невялікую. Чатыры дойныя каровы, дзве ялоўкі і пару коней, не лічыўшы свінак у хлявах. Мужык маладой немкі на фронце ваяваў. Дзяцей не мелі.

Дом і абора мураваныя былі. Стадола з дзерава. Мне прызначылі пакойчык на паддашку. Займаўся я гаспадаркай, араў, сеяў, касіў сенажаці ды за каровамі наглядаў. Пані Фрыда сама кароў даіла, але я часам дапамагаў. Калі яна тры выдойвала, дык мне адну пакідала. Каровы пародзістыя былі. Ад адной па вядры малака надойвалі. Паша ад забудовы знаходзілася каля кіламетра. Жывёлу пакідалі на пашы. Малако дамоў прыносілі. Два вёдры гаспадыня несла і я два забіраў. Раніцай на станцыю завозіў і на поезд здаваў. Пасуда была нумараваная. На другі дзень, як заносіў малако, дык пустыя бітоны забіраў.

У маіх баўэраў сын у вёсцы Ляунаў жыў. Юзэфам, па бацьку, назвалі. Жонку Кэйтай клікалі. У іх было трое дзетак — маленькі хлопчык і дзве дзяўчынкі. Годзікаў па 4-5 мелі. Стары Юзэф дапамагаў сыну ў летні час. Мяне з сабою на сенакос забіраў. Сечку для кароў рэзаў.

Харчаванне слабенькае давалі. Хлеб ды кава на снеданне, а на абед тоўчаная бульба з поліўкай і кусочак мяса. На вячэру малочная каша. Так штодзень было.

Як фронт падходзіў, мяне прызвалі абаронную лінію будаваць. Праз месяц калодзежныя зрубы рабіў, якія немцы выкарыстоўвалі для будовы бетонных бункераў (у іх пакідалі шчыліны для кулямётаў). Затым у маёнтак вярнуўся. Другім разам забралі для капання акопаў. Перавезлі пад літоўскую граніцу. Там даўжэй я застаўся. З надыходам фронту пад Сувалкі перамясцілі. За намі наглядалі нямецкія вайскоўцы ў ясна-жоўтых уніформах. Акопы вялікія капалі — тры метры ўглыб і шэсць метраў шырыні. На адным метры трох капачоў ставілі. Калі адзін капаў, дык другі зямлю выкідаў, а трэці ямку чысціў. Кватараваліся ў вялікім памяшканні. Некалькі соцень людзей змяшчалася. Спалі на падлозе не распранаўшыся, на пледзе. Кармілі ў дзень два разы, як на работу ішлі, і як вярталіся. Хлеб, маргарын і ячная каша былі асновай харчавання на працягу ўсяго дня. Аднойчы, як акопы капалі побач шашы, рускі самалёт надляцеў і страчыць з кулямёта пачаў. Разбегліся ўсе хто-куды. Я пад мост схаваўся. На акопах былі разам Мікалай Лашкевіч з Зубачоў і Васіль Шатыловіч з Чаромхі. Яго, як рускія прыйшлі, дык у савецкую армію ўключылі і ў Савецкі Саюз трапіў. Там ажаніўся. Пасля весткі па ім загінулі.

З акопаў я ўцёк у маёнтак з Янкам з-пад Навагрудка і Антосем з-пад Брэста. Вошы заядалі. Войска нямецкае не прапускала ўцекачоў. Жандары затрымалі. Загналі на хутар і памесцілі ў склепе з бульбай. Да адвячорка прасядзелі. Раніцай зацірку з малаком прынеслі. На трох адну вялікую міску. Затым у горад пад канвоем завялі. У будынку шмат жандараў было. Кожнага паасобку дапытвалі. Мы тлумачылі, што прыязджалі туды з гаспадарамі збожжа малаціць (раней так дамовіліся). А калі сам начальнік жандараў дапытваў і яму такое ж сказалі, дык паверыў. Выходзячы ад жандараў сказалі вартаўніку, што мы галодныя. На дарогу выдалі нам тры буханкі хлеба і тры пачкі маргарыну. З гэтага горада (назва не запамяталася) у Кёнігсберг на цягніку паехалі. Немцы ўраспалох уцякалі. На станцыі ў Кёнігсбергу я хацеў багаж старой немцы памагчы несці. Тая пачаткова недаверліва глядзела, але калі ёй растлумачыў, хто я такі і куды падаюся, дык прыняла маю прапанову. Запытала колькі мае плаціць. Папрасіў я адно хлеб. Падала картачкі на хлеб і грошы, каб яго выкупіць. У падарожжы ў маёнтак бачылі, як гналі маладых хлопцаў на акопы. Нечакана падышоў да нас мужчына ў цывільным адзенні і падняўшы борт плашча паказаў значок, патрабуючы дакументаў. Прачытаўшы пасведчанне выдадзенае начальнікам жандараў, вярнуў назад і дазволіў ехаць далей.

У маёнтку Фрыда з бацькамі рыхтаваліся да дарогі. Я зрабіў дугу з ляшчыны і прыспасобіў да фурманкі. Гаспадары ўцякалі перад рускімі. На дарогах была процьма нямецкага войска, якое змешвалася з цывільнымі ўцекачамі. Так даехалі да Гданьскага заліва. Была зіма і вада пакрылася лёдам. Памаленьку падаваліся ўперад. Два дні і ноч прабіваліся праз заліў. Фура за фурай аддалялася некалькі дзесяткаў метраў. Гэта па прычыне боязі перад заламаннем лёду. Калі я запытаў гаспадара-немца, колькі так трэба ехаць, дык ён адказаў, што каля 70 кіламетраў. Пад'язджалі да горада. Чуваць было выстралы. Фронт штораз бліжэй падыходзіў. Фургонам я кіраваў. Выехаўшы на бераг, азірнуліся назад. Відаць было праломы і плывучыя ільдзіны. Заначавалі ў лясочку над морам. Прылеглі на пасланні з галінак дрэў. Затым раніцай рушылі ўперад і прыехалі ў вялікі маёнтак. За намі падавалася некалькі фурманак. Пад'язджаючы да забудоваў прыкмеціў на даху хлява нямецкага назіральніка з карабінам. З яго жэстыкуляцыі зразумеў, што рускія падходзяць. Праз некалькі дзён рускія прыйшлі. Нямнога іх было. Двух салдат забралі нашаму гаспадару некалькі кілаграмаў цукру. Старая немка ўсхвалявана гаварыла: „Рускі Іван забраў цукар. Мы несалоджаную каву будзем піць". Я падаўся за адыходзячымі салдатамі і папрасіў вярнуць цукар. Аддалі цукар назад. Падраздзяленне рускіх салдат спынілася на даўжэйшы адпачынак. Капітан папрасіў мяне сабраць пашу для коней. Быў рослым мужыком і падаваў від асілка. Хто яму супраціўляўся, дык меў звычку нагой тупаць для страху. На фурманку грузілі авёс забраны немцам у маёнтку. Усяго не забіралі. Частку пакідалі. Капітан прапанаваў мне ісці за падраздзяленнем, але я адмовіўся. Пад стражай перавезлі ў Пілаў. Памясцілі ў казармах. Прыехаў падпалкоўнік і загадаў: хто ў арміі служыў, выступіць управа, а хто не — дык на левы бок. Я далучыўся да другіх. Ранкам навабранцаў апранулі ва уніформы і пагрузілі на аўтамабілі. Навічкоў вучыць пачалі. Аднойчы ў мяцеліцу на заняткі выгналі. Пачаткова на трапецыі займаліся, затым маршбег зрабілі. Наступнага дня дваццаць з нашых захварэлі. Запаленне лёгкіх схапіла. На аўтамабілях у бальніцу перавезлі. Сем тыдняў пралежаў я ў шпіталі. Начальнік лячэбніцы ў чыне маёра сказаў, што заўтра зробіць выпіску. На світанні медсястра абвясціла: „Ребята! Война окончилась!"

Пасля выпіскі з бальніцы мяне прызначылі ў гаспадарчы ўзвод. Там згуртавалі каля трыццаці хлопцаў і дзяўчат. Мы лапалі паслянямецкіх коней і кароў, а рускія іх дзесьці адсылалі. За намі наглядалі салдаты. Пасля выдалі кожнаму двое коней да фурманкі і трэцяга ў прыпрэжку, ды сказалі даставіць у Ваўкавыск. Апранулі ў шынялі і кожнаму выдалі зброю. Для аховы транспарту прызначылі кулямёт. Гэта было пад восень. У Ваўкавыску загрузілі нам на тры фурманкі аўса. Вяртаючыся са складоў сустрэў я аднавяскоўца Сцяпана Кердалевіча. Ад яго даведаўся, што ў горадзе многа чарамшукоў і мая сястра Марыя тут знаходзіцца. На Козігорах жыве. Не паспеў я коней выпрагчы з фуры, а тут і Марыя заходзіць. Сказала, што можна дамоў збірацца.

З Ваўкавыска перамясцілі ў Гродна. Закватаравалі ў міжнародным лагеры паводле нацыі. У дзевяноста першай зямлянцы жылі палякі. Маёр Рогаў запісаў да рускіх і назначыў на Харкаўскі цэментазавод. У Харкаў я не паехаў. На два дні ў гэты час у Ваўкавыск падаўся. Маёр назначыў тады ў Маскву. У лагер на інспекцыю прыехаў палкоўнік. Я прад'явіў яму, што хачу да сям'і ў Польшчу вяртацца, але маёр Рогаў не дазваляе. Пасля размовы выклікаў палкоўнік маёра Рогава і даў яму выгавар, а мне сказаў ісці ў дзевяноста першую зямлянку. На падарожжа выдалі новае адзенне ды прадукты. Так вяртаўся на бацькаўшчыну пасля трохгадовага зняволення.

Запісаў Уладзімір СІДАРУК

Старая фатаграфія

Люблю глядзець старыя здымкі. Нагадваюць яны маладосць, працу, сяброў і сяброўак. Перада мною фатаграфія групы настаўнікаў беларускай мовы. З надпісу на адваротным баку фатаграфіі я даведаўся, што былі гэта цэнтральныя курсы настаўнікаў беларускай мовы ў Аўгустове. Здымак быў зроблены 16 ліпеня 1954 г.

У цэнтры здымка сядзіць кіраўніцтва курсаў. Злева: (у акулярах) Уладзімір Станкевіч — начальнік аддзялення Дэпартамента ў Міністэрстве асветы (пазнейшы старшыня БГКТ у 1958-1960 гадах); побач — супрацоўніца Акадэміі навук прафесар А.С. Фіброўская; за ёю — настаўнік беларускай мовы ў Беларускім ліцэі ў Бельску-Падляшскім Ілья Бэрнат і кіраўнік курсаў Мікалай Лебядзінскі.

Звяртаюся да ўвекавечаных на гэтым здымку настаўнікаў з заклікам падзяліцца на старонках „Нівы" сваімі ўспамінамі аб курсах і педагагічнай працы. Вашы ўспаміны будуць карыснымі цяперашнім настаўнікам, якія працягваюць Вашу місію прывіваць у школьнікаў любоў да роднай мовы.

Віктар БУРА

Не прыйшлося загінуць

Успаміны Надзеі КАВЕЙШЫ з Сынкоўцаў.

Перад вайною мужчыны збіраліся і гаварылі, што тут штось вынікне. І зараз немец стаў. І папёр аж у Расію.

У нас кухня стала і немец запёр нас бульбу скрэбці. Хадзіў па гумнах, каб зярняці ў іх не было. Свінча нельга было калоць, бо як знойдуць, то куля!

Да нас тройчы карта ў Германію прыходзіла. І брат паехаў; ён у немца кароў даіў. Мы яму хлеб сушылі і ў пачках пасылалі.

Мяне вывезлі ў Татаркоўцы за Кузніцай. Там немец на бальшавіка гатовіўся і ад нас туды каменне вазілі. Я гнілую бульбу ў склепе перабірала. Туды даходзілі жанчыны з вёсак, а апрача мяне яшчэ дзве сталыя былі: адна з Калёніяў, а другая з Пасілянцаў, што цяпер за граніцай. Пасля адзін немец, якому руку адарвала, рэкамендаваў нас у кухню. Там працавала 75 чалавек. І мы тады ажылі. Пасля той немец папярэдзіў нас:

— Уцякайце, бо як прыйдуць бальшавікі, то пагінем усе.

І я вярнулася ў вёску.

Як уцякалі немцы, мы ў полі жыта нажалі і курам вяроўкамі неслі. Немцы нас пераступілі і адзін з ружжом выйшаў. Але тата ўмеў па-нямецку і яны нас у вёску прыгналі. Прасілі вады. Адна ім кіслае малако вынесла і яны загадалі ёй выпіць. Калі яны адышлі, наляцелі рускія і іх палапалі.

Хадзілі партызаны, у нас у куфры здымак знайшлі, быццам я з бальшавікамі. Але солтыс сказаў, што гэта не я і так я асталася жывая. Той здымак мой брат з лесу быў прынёс, а я яго сабе пакінула; а здымкі былі бальшавікоў.

А хто тыя партызаны — пярун іх ведае! Прыдзе ў ваенным, нацягне нейкую шапку і не пазнаеш. Раз мужа збілі прыкладамі:

— Oddaj płaszcz niemiecki!

А які той плашч — хто яго ведае!

Але ўсё ж так склалася, што не прыйшлося загінуць.

Запісаў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Прыгода з гіпнатызёрам

Сярод жанчын існуе непераможная цяга да дасканаласці. Мае яна быць не толькі добрай гаспадыняй, інтэлігентнай, дасціпнай, не толькі задбанай, але і павінна мець фігуру манекеншчыцы. Каб дасягнуць ідэал прыгажосці, які прапагандуюць усе сродкі масавай інфармацыі, а найбольш жаночыя часопісы, прыгожы пол пачынае змагацца за хударлявую фігуру. Спосабаў на гэта многа. Аж у галаве можа закружыцца ад цуд-дыетаў, прэзідэнцкіх супоў, лякарстваў на абмежаванне апетыту. Праблема аднак у тым, што большасць гэтых сродкаў не памагае, а і заплаціць за іх трэба немалыя грошы.

Аднак жывуць сярод нас „геніяльныя" людзі, якія на ўсё знойдуць спосаб — нават на лішнія кілаграмы. У апошнім часе ў беластоцкіх газетах паявіліся аб'явы аб гіпнатычных сеансах, якія памагаюць вызваліцца ад лішняй вагі. Жанчыны, спакушаныя перспектывай выгляду манекеншчыцы, звоняць і дамаўляюцца на візіты. Я пазваніла таксама і то не аднаму гіпнатызёру, каб выбраць найцікавейшую і не надта дарагую прапанову. Размовы былі падобнымі. Кожны „спецыяліст" прапанаваў найноўшыя метады працы з арганізмам і целам пацыента на працягу ад трох да дзесяці сеансаў. А які будзе эфект? Стопрацэнтны, — упэўнена адказвалі мае размоўцы. З усіх намоў я выбрала прапанову старшыні арганізацыі, якая гуртуе гіпнатызёраў.

Спатканне было назначана на 10 гадзіну раніцы. Першы шок перажыла я, калі пабачыла кабінет, у якім меў адбыцца сеанс. Пакойчык памерам чатыры на пяць метраў, застаўлены мебляй ненайлепшай якасці, са старым зялёным крэслам і абдзертым ложкам, якое можна спаткаць у шпітальных кабінетах... І да гэтага цяжкі пах ад гарэючых пахучых рэчываў і шматлікіх свеч. Ух! — на сам успамін аж трасе чалавека!

Біяэнергатэрапеўт з вялікай заангажаванасцю пачаў спатканне. Спачатку трычатыры хвіліны спаглядаў на мяне, каб адчуць маю энергію, а затым, пацмокаўшы вуснамі і пакруціўшы галавой, стаў апісваць маё жыццё. Сцвердзіў адразу, што я — вельмі скрытая і баязлівая асоба, якая мае вялікія праблемы з наладжваннем кантактаў (з чым мае сябры, як і я сама, зусім нязгодныя). Паінфармаваў таксама, што найлепшая прафесія для мяне — ветерынар або праца ў хімічнай лабараторыі. „Не дай Бог, каб вы сталі юрыстам або журналісткай, або вывучалі замежныя мовы. То ж у вас матэматычныя здольнасці", — сказаў абураны, калі пачуў ад мяне, што я думаю наконт прапанаваных ім прафесій (на жаль, не ведаў, што пішу ў „Ніву" і вучуся на юрыдычным і філалагічным факультэтах).

На маё пытанне, дзе ён здабыў прафесійную падрыхтоўку, мой суразмоўца злосна адказаў: „Не ў Варшаўскім універсітэце, а як скажу, што ў Маскоўскім, то не будзе гэта калоць у вочы?" — „Не, чаму?" — адказала я адразу, спаглядаючы на дзверы і ацэньваючы магчымасці ўцёкаў з кабінета.

Да сваіх вывадаў аб маёй асобе дадаў яшчэ праблему, як сказаў, „усіх маладых людзей" — узаемаадносін з бацькамі. Тут ён таксама памыліўся, бо праблема паразумення з бацькамі ў мяне адсутнічае. Такіх несапраўдных сцвярджэнняў было намнога больш, а гэтую „чыстую праўду" аб маёй асобе чытаў ён з „энергетычнай аўры", якая мяне акружае...

Мяне найбольш цікавіў спосаб скідкі лішніх кілаграмаў. Аказалася, што адразу трэба заплаціць 350 злотых. Лішнія кілаграмы мелі самі „сыходзіць" з цела, дзякуючы думцы, якую ўвядзе ў маю галаву гіпнатызёр. А вынікі былі б відавочнымі ўжо на другі дзень (1,5 — 2 кілаграмы штодзень)...

Але тут развага пераважыла ўва мне. Як доўга можна слухаць такую лухту? — падумалася. Вытрымала я гадзіну і сорак мінут, але мая цярплівасць скончылася, калі паступіла прапанова зрабіць рэляксацыйны масаж („Bo taka pani spięta", — сказаў гіпнатызёр).

Культурна адмовіўшыся ад масажу, падзякавала я за спатканне і сказала прыязным тонам: „Падумаю і пазваню вам".

Так закончылася мая прыгода з гіпнозам. Аднак многія жанчыны, а нават маладыя дзяўчаты, карыстаюцца паслугамі, якія не заўсёды бяспечныя для цела і душы. Ды можа і варта задумацца, ці трэба шукаць дапамогі ў гіпнатызёраў, біяэнергатэрапеўтаў і падобных „спецыялістаў" і набіваць кішэні псеўдалекарам. Можа лепш пакарыстацца старым рэцэптам м.ж.б.р (для незарыентаваных рассакрэчу гэту абрэвіятуру: менш жэрці — больш руху), а фігура можа не манекеншчыцы, але прыгожай жанчыны з часам паявіцца.

Паўліна Шафран

Сродак інфармацыі

Сёння радыё, магнітафон ці тэлевізар гэта звычайныя прылады, бо кожны іх мае, часам нават замнога. Але калісьці амаль ніхто гэтага не меў, а людзі прагнулі вестак са свету. Перад вайною толькі некалькі чалавек мелі свае радыёпрыёмнікі, і то з навушнікамі. У Дубічах-Царкоўных Арцём Чыквін першы раздабыў такое радыё — сам слухаў і іншым даваў паслухаць і гэта было як свята. А дзядзька Яшка сам сканструяваў такое радыё і ўначы мог нават слухаць Маскву, хаця бацюшка Мірон у сваіх пропаведзях асцерагаў прыхаджан, каб не верылі весткам з Масквы, бо адтуль сочыцца адна мана і хвальба. Сам бацюшка купіў сабе вялікае радыё на батарэі і людзі таксама слухалі. Аднойчы дзядзька Яначка, быўшы ў бацюшкі, пачуў з Масквы папулярную песню „Если завтра война", перахрысціўся і сказаў:

— О, Госпадзе! Заўтра вайна, што ж нам рабіць?

Бацюшка засмяяўся і сказаў:

— Не бойтесь, это только песня.

Аднак наіўны Яначка амаль не ўгадаў, бо хутка і сапраўды выбухла страшэнная вайна. Ужо пры саветах у доме бацюшкі мясцовыя ўлады зрабілі „красный уголок", свайго роду святліцу, і кожны мог слухаць радыё, якое пакінуў уцякаючы Мірон. У час акупацыі людзі не мелі права слухаць ніякага радыё, ды і не яно было тады ў галаве.

Пасля вайны Арцём зноў першы купіў (а мо гэта было яго старое) радыё з навушнікамі. Затым прыдбаў радыё і мой дзед Дзмітры Шуль і я слухаў музыку і весткі з Варшавы. Здавалася мне, што буду слухаць круглыя суткі; такая была ў мяне прага. Пасля, у 1956 годзе, у вёсках увялі „точкі" і не трэба было навушнікаў, бо голасна трубіла з адной Варшавы і людзям здавалася, што гэта вялікі крок наперад. А сапраўднае радыё, з весткамі з цэлага свету, мала хто меў, бо людзі аднак бедна жылі, хаця сёння чуваць, што пры камуне было райскае жыццё.

Некаторыя думаюць, што даваенная Польшча не вырабляла радыёпрыёмнікаў, але гэта няпраўда, бо рабіла выдатныя і прыгожыя прыёмнікі. Мой сын, майстар-электронік, мо некалькі дзесяткаў такіх радыёпрыёмнікаў адрамантаваў. Купіў іх папсаванымі і здорава папрацаваў, каб давесці іх да ўжывання. Мае таксама і даваенныя нямецкія прыёмнікі, і пасляваенныя савецкія, і іншыя. Польшча ў міжваенны перыяд вырабляла добрыя тавары, толькі нам, сялянам, яны былі недаступныя.

Мікалай Панфілюк

Як выйграў Нікіфар

Нікіфар са сваёй жонкай Агатай жывуць у адной з вёсак Нарваўскай гміны. Пажылыя гэта людзі, ім ужо за семдзесят гадоў. Аднойчы Нікіфар кажа мне: здаецца я не дурны чалавек і мая жонка таксама многа ў чым разбіраецца, а тут адзін незнаёмец так нас абдурыў. І расказаў мне пра такое вось здарэнне.

У пачатку снежня 2002 г. у Нікіфараву хату зайшоў малады мужчына. Прадставіўся, што ён быццам з беластоцкай „Бядронкі" і папрасіў, каб мы з Агатай назвалі лічбу ад 1 да 9. Калі мая жонка назвала лічбу 4, незнаёмы мужчына паглядзеў у паперы ды сказаў: „Пані нічога не выйграла". А калі я назваў лічбу 8, тады незнаёмец радасна заявіў: „Вы маеце шчасце, вы выйгралі!" І пачаў даставаць з сумкі нейкія рэчы ў прыгожай упакоўцы ды ставіць іх на стол інфармуючы, што гэта прылады для нарыхтоўвання салатаў вартасцю ў 200 зл. У другой упакоўцы была тэфлонная каструля з сеткай вартасцю 150 зл. Малады чалавек дастаў яшчэ трэцюю пачку, у якой быў камплект сталовых нажоў і напільнік для вастрэння іх. Сказаў, што за гэты набор трэба заплаціць 199 злотых, а папярэдні тавар гэта — выйгрыш! Тады Агата ўзяла з шафы кашалёк з грашыма і заплаціла. Малады чалавек пажадаў, каб добра карысталіся мы тымі прыладамі і адыходзячы дадаў: калі б нехта з „Бядронкі" прыехаў яго кантраляваць, дык скажыце, што быў добрым і сумленным аквізітарам. Залежыць яму на гэтым, бо „Бядронка" плаціць яму стыпендыю ў Вышэйшай тэатральнай школе імя Мельхіёра Ваньковіча ў Беластоку. Сказаўшы гэта развітаўся і выйшаў з хаты. Тады Нікіфар з Агатай кінуліся аглядаць свой выйгрыш і згодна прызналі, што гэтыя прадметы ні да чаго ім непрыдатныя. Выбеглі з хаты, каб вярнуць ашуканца і забраць свае грошы, але па ім ужо след прастыў.

Запісаў Мікалай Лук'янюк

У „Ашоне"

Аб гандлёвым цэнтры „Ашон" чуў адны пахвалы: багаты выбар тавару, нізкія цэны і шмат прамоцый. Пакупкі рабіў я 7 снежня. Вочы разбягаліся па стэндах. Спадабаліся гафтаваныя сурвэткі. Па дзевяноста пяць грошаў, — думаю, — цана невысокая. Дзве сурвэткі ўзяў. Усяго назбіралася на некалькі дзесяткаў злотых. Упершыню ўбачыў, як машына ў мяшочкі тавар падае (касірша размяркоўвае). Культурна! Маю звычку чэк захоўваць. Калі пераглядаў цэны, дык прыкмеціў, што пры сурвэтках запісана не 0,95 зл. а 1,39 зл. Няўжо камп'ютэр памыліўся. Другім разам, а было гэта 31 снежня, купляў яйкі. На стэндзе віднела цана 7,46 зл. за ўпакоўку (30 штук), а на чэку запісана 9,49 зл. Зараз не сумняваюся, што хтосьці ў „Ашоне" на хітрасць хварэе, або не дапаўняе службовых абавязкаў. Так ці інакш, кліента набіваюць у бутэльку. Калі наўмысна стаўляць нізкія цэны, каб прыманіць пакупнікоў, дык хітрунамі павінна пацікавіцца Дзяржаўная гандлёвая інспекцыя. На несумленных прадаўцоў, якія не пераменьваюць цэны пры павышэнні ў час новай пастаўкі, таксама ёсць біч — дырэктар цэнтра. Гэта ён павінен больш цікавіцца працай падначаленых. А мо я вінаваты, што не правяраў чэкаў на месцы? У адным перакананы: два разы абдурылі. На трэці раз не дазволю!

Уладзімір Сідарук

Актыўныя юныя танцоры

Адным з актыўнейшых калектываў, якія дзейнічаюць у Гмінным цэнтры культуры, спорту і адпачынку ў Міхалове, з'яўляецца дзіцячы калектыў песні і танца. Вядзе яго інструктар Рышард Варобей. Гурт налічвае дванаццаць асоб, вучаніц першага, другога і трэцяга класаў Пачатковай школы.

Дзяўчаткі прыходзяць у Гмінны цэнтр культуры па пятніцах і суботах. Калектыў пачаў працаваць у кастрычніку мінулага года. Першае сваё публічнае выступленне калектыў даў 11 лістапада і выклікаў фурор. Гэта вельмі заахвоціла дзяўчатак да сістэматычных рэпетыцый. Цяпер рыхтуюцца яны, між іншым, да выступлення на Аглядзе дзіцячых мастацкіх калектываў, які адбудзецца ў красавіку ў Бельску-Падляшскім.

Янка Целушэцкі

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://republika.pl/niva_bielastok/*
E-mail: *niva_bielastok@poczta.onet.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2003 r. upływa 5 marca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na II kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

А ну яе, з тою Уніяй! Як і жылі, жыць будзем...

Еўрасаюз, як ты мне мілы...

А ну яе, з тою Уніяй!

Уступ. Унія ў нас ужо бушуе, а нам да яе ўсё яшчэ далёка.

Дзве вясковыя жанчыны, якія жывуць дзякуючы гадоўлі малочных кароў, размаўляюць. Адна кажа:

— Вось калісь дык добра было! Падоіш карову з гною, завязеш малако ў злеўню, і грошыкі атрымаеш.

— А цяпер, — не вытрымала другая, дык калі хочаш здаваць малачко, дык яны ўсе жылы з цябе выцягнуць. Падумаць толькі, штотыдзень кантроля нейкая, а ўсё ў хляве мае быць чысценька і пабелена, як у палацы якім. А найгорш, што цыцкі каровам трэба перад даеннем мыць. Няхай толькі заўважаць, што нямытыя!

— А ну яе, з тою Уніяй! — падсумавала першая жанчына.

Падслухала Ада Чачуга

Факты і высновы

Жыве Лукашэнка!

Паводле Галоўнай статыстычнай управы Польшча ў параўнанні з 2001 годам паменела на 11 тысяч жыхароў. І то ў перыяд наступу антыаборцыяністаў. Перапуджаныя дэмографы ўсе надзеі ўсклалі на Лукашэнку. Чакаюць, калі ён урэшце здзейсніць абяцанне і пусціць праз мяжу азіяцкі вал, што качуе ў беларускіх аперацыйных лагерах. Як выявілі разведчыкі „Wprost", у першай лініі пойдуць касавокія юрліўцы.

Keine Angst! — як мовілі яцвягі, дэмаграфічнай катастрофы не будзе.

Сідар Макацёр

Адгаданка



1. Пётр, І сакратар ЦК КПБ у 1965-80 гг., 2. Анатоль, старшыня Палаты Прадстаўнікоў РБ, 3. Ціхан, І сакратар ЦК КПБ у 1980-83 гг., 4. Вячаслаў, старшыня Савета Міністраў РБ у 1990-94 гг., 5. Яфрэм, І сакратар ЦК КПБ у 1986-90 гг., 6. Кірыла, І сакратар ЦК КПБ у 1956-65 гг., 7. Мікалай, І сакратар ЦК КПБ у 1983-86 гг., 8. Мікалай, старшыня Вярхоўнага Савета БССР у 1990-91 гг., 9. Мячыслаў, старшыня Вярхоўнага Савета РБ у 1994-95 гг.

Літары ў светлай калонцы складуць першую частку рашэння. Другую частку рашэння складуць літары з пазначаных курсівам палёў. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

(Ш)

Адказ на крыжаванку з 49 нумара

Гарызантальна: ачаг, дзіда, Олбані, арол, венік, абажур, гаспадар, рыцар, Хайдэнаў, саланчак, раяль, сімплекс, даміно, акунь, ляда, кабура, смута, такт.

Вертыкальна: дзверы, адліга, чарапаха, голад, абшар, індус, каранцін, байдарка, рыса, цаля, унія, куль, акалодак, аскома, лянота, кажан, сінус, молат.

Рашэнне: **Малы падарак даражэй вялікай абяцанкі**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Лявону Федаруку** з Рыбалаў.

З'есці акты

Жыццё не папяровае. Жыццё таксама і не цэлулоідны кадр. Не міргаючы рыскамі срэбны ці светла-зялёны экран тэлевізара. А скажы ты спажыўцам таго прывіднага жыцця, што гэта ўсё няпраўда. Што гэта не жыццё. Праўда, скажуць, — не жыццё. І далей будуць паглынаць дурныя тэксты з-пад каляровых відаў ды сляпіцца ў тэлік.

Пачаў я гэтак і да Агаты. Як-ніяк, яна ж прыкладная жанчына. Гаспадыня, жонка, суседка... спажывец культуры, палітыкі і хлеба надзённага. І я не іншы.

— І ты не іншы, хоць тут выпендрываешся! — памахала на мяне апалонікам мая жонка. Якраз варыла гарохавы суп. А гарохавы суп, ежа армій і пралетарыят — вобразны выраз сусветнае культуры. Я гэтак і кінуў маёй Агаце ў бок паруючых гаршкоў.

— А ты падумай, пакуль з'ясі, што гаворыш. У Гдыні, вось, арыштавалі нейкага Яна К. Затрымала яго паліцыя, як выбіваў вокны ў жончынай кватэры...

— Ну?

— Дык яго, Вандал, распытвалі пра тыя вокны, ён і прызнаўся, што, праўда, павыбіваў іх. Гэтак і спісалі ў пратаколе.

— Ну??! — я прынюхаўся да смачноты, што паравала з-пад покрыўкі. — Я ніяк не разумею, прычым тут мае заўвагі наконт культуры, а твае — кухні.

— Калі пра ежу... Вось той Ян К., у час, калі зачытвалі ягоныя паказанні, раздумаўся і ў адчаі спрабаваў з'есці той пратакол. І з-за гэтага юрыдычна змянілі катэгорыю правапарушэння. За выбітыя шыбы пагражаў яму невялікі штраф, а за спробу знішчэння дакументаў могуць прысудзіць яму нават два гады турмы.

— Дык трэба карміцца, так сказаць, з галавою. Ну, як там твой суп?

— Ужо гатовы. Трошкі толькі майрану дакіну.

— Не забывай, даражэнькая, што я за майранам не прападаю.

— Дзе ж я забуду, жыўшы з табою больш чым паўстагоддзя! І што табе ўнутры добра, а што не, і пра што ты слухаць любіш... Табе, як звычайнаму Скарпіёну, даспадобы хвальба твае патэнцыі...

— Перш за ўсё інтэлектуальнай! — заўважыў я і апусціў лыжку ў глыбокую талерку. — Ой, Агата, як смачна!

— Ты, як тыповы Скарпіён, надта ж жарсны... І смак у цябе вельмі ж развінуты...

— І дотык! — прытуліў я да сэрца маю гаспадыньку. А тая пасміхнулася.

Ведае — пахваліць мяне, дык раблюся як пластылін. Цікава, што ёй сёння ад мяне трэба.

— Нічога мне ад цябе, Ванюшка, не трэба, — як заўсёды без слоў зразумела мяне мая дарагая палова. — Толькі, от, паехалі б куды...

— Можа, у які цёплы край? На твой радыкулітчык? — пацёр я Агаціна сцягно. Мабыць, атрымалася гэта не надта па-медычнаму...

— І на твае, Вань, дабротныя справы. Ой, так, так, прыдалося б тое-сёе адмарозіць...

— Э-гэ-гэ! — засмяяўся я, мабыць, залішне гучна. — Калі штосьці замарожаным здаецца, дык можа гэта і лепш...

Вандал Арлянскі

Мядзведжыя падаткі

— У адных ёсць, і яны аддаюць мядзведзю, што мае быць мядзведжае, а ў іншых таксама ёсць, але яны не аддаюць. Гэтак жа ж быць не можа! — З такою думкай прачнуўся мядзведзь Сандар Жоржавіч у ранне чарговага сходу ўсяленнага кіраўніцтва. Толькі паставіў цвёрда лапы на зямлі, пацягнуўся ў свіран. Каб таго-сяго паесці. А там — пустэча. Асталіся толькі арэхі, якія канфіскаваў дзяцел Стукач з лішкаў вавёркі Кацюшы, якая хацела іх збыць па нізкай цане на чорным узлеску. Аферыстку злавілі, калі, перасковаючы з дрэва на дрэва ў бок чорнага ўзлеску, з пыскі выпусціла аграмадны ў параўнанні з ёю самою грэцкі арэх.

— То ж не буду я грызці арэхаў, — падумаў, заглянуўшы ў змесціва свірна і злосны ад голаду Сандар Жоржавіч.

З гэтай нервовасцю і вуркатам у жывоціску рушыў на паляну, дзе рэшта ўсяленнага кіраўніцтва вастрасловіла сабе па ранішняй страве. Калі яшчэ нават дзятлаў зрок не прыкмеціў брыдучага на сход мядзведзя, на паляну даляцелі таямнічыя гукі: — Бр-р-р, буль-ль, бр-р-р-р. Звышчулая ад здарэнняў у ейнай дарозе ў чорны ўзлесак вавёрка прарочыла:

— О, здаецца, чую, што, як кажуць з таго боку Белавежжа, у траве пішчыць.

Кіраўніцтва набрала вады ў раты з таючых снягоў.

Прадчуванне не зманіла вавёрку.

— Ну, і што?! Добра вам?! Усе сытыя?! — злавесна прабурчаў Жоржавіч, укрочыўшы на паляну.

— Ну, быццам бы... — хацеў штосьці сказаць дзік Свіналыч лычом упэцканым гразвю з парудзённай адлігі і ад гарцавання па лесе ў паспяховых пошуках каштанаў.

— Быццам бы, быццам бы... Што такое — быццам бы?! Няма быццам бы! Мой свіран пусты. І гэта не быццам бы. І што вы намерваецеся ўчыніць, быццам бы, дзеля свайго, быццам бы, мядзведзя? — быццам рашуча спытаўся Сандар.

— Я... — нясмела пачала вавёрка. — Я... магу вам налузаць арэхаў, з таго, што ў мяне засталося.

— Ведаеце, вавёрка, куды я паслаў вашы арэхі? — успеніўся мядзведзь.

— Не... — узняла брывы перапалоханая Кацюша.

— Вашы арэхі — у маім свірне. Вы, можа, думаеце, што мая мядзведжая велічнасць дазволіць мне пэцкацца з гэтымі арэхамі? Бачу, што ў нікога няма ідэі. Ну, добра. У мяне, як заўсёды, яна ёсць. Пастанаўляю, што ад сёння на кожнае лясное стварэнне будзе наложаны падатак, без выключэнняў. Так, і на вас, дзяцел, таксама.

Стукач ад уражання ўбіў свой дзюбак у адзіную на паляне бярозу. Да сёння заўсёды мядзведзь яго ўзнагароджваў за адданасць і верную службу і нічога больш не трэба было, а тым больш у ягоную птушыную галаву не маглі б прыйсці нейкія падаткі.

— Лепш маўчаць. Мядзведзь галодны — мядзведзь злосны, — падумаў верны Стукач.

— А калі хтосьці нічога не робіць, дык таксама наложаць на яго падатак? — адважылася спытацца лань Гаўрусіха, якая ўсё здабывала дзякуючы красе ды зграбнасці.

— Тады будзе падатак ад гультайства, бо ці ляжаць, ці стаяць, мядзведжы падатак трэба аддаць. Вам усё зразумела?

— Ыгм! — хорам адказала кіраўніцтва і разбрылося па лесе ў пошуках бяздонных падаткавых крыніц.

Мядзведзь, падмацаваны ўяўленнем лепшай будучыні, вярнуўся ў сваю бярлогу:

— Крышку пасплю, пачакаю, пакуль папрыносяць падаткі, толькі каб, на ліха ліхое, не арэхі!

Сандар Жоржавіч заснуў. Перастала яму нават бурчэць у шлунках. У сне явіліся яму падаткі: кучы падлы, прывалочанай у правадырскую сядзібу.

— Падаткі.. больш падаткаў... — спрасонку мармытаў задаволены Сандар Жоржавіч.

МакХолад

ISSN 0546-1960